КАБ ЭКЗАМЕНАТАР НЕ ПАСТАВІЎ «НЕЗДАВАЛЬНЯЮЧА»...

5

БЫЦЬ ПАЧУТЫМ НА ВЫСОКІМ УЗРОЎНІ

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

20 САКАВІКА 2020 г.
ПЯТНІЦА
№ 55 (29169)

9-24 стар. МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

+TV ПРАГРАМА

ЦЫТАТА ДНЯ

Ігар КАРПАЎ, доктар медыцынскіх навук, галоўны пазаштатны спецыяліст па інфекцыйных захворваннях Міністэрства аховы здароўя:

«Гэта той час, калі неабходна праявіць самае прафесійнае і цёплае стаўленне да нашага пажылога пакалення. Справа ў тым, што асноўны кантынгент рызыкі — гэта пажылыя людзі з сур'ёзнымі спадарожнымі захворваннямі. Да гэтага кантынгенту людзей цяпер трэба праявіць максімальную ўвагу. Зараз вельмі шмат залежыць ад грамадства. Трэба паглядзець вакол сябе, зразумець праблемы адзінокіх людзей і прыняць меры, каб засцерагчы іх ад інфекцыі».

КАРАТКА

- **Грузавыя аўтамабілі экалагічнага класа 6, якія ўвозяцца ў Беларусь, вызваляюцца ад утыльзбору і ПДВ.**
- Цырымонія перадачы алімпійскага агню прайшла на Панафінійскім стадыёне ў Афінах.

- **Колькасць самазанятых у бытавым абслугоўванні насельніцтва Мінскай вобласці за год падвоілася.**
- У Мінскай вобласці на аднаго беспрацоўнага прыпадае амаль 10 вакансій.
- **Расійскія навукоўцы здолелі расшыфраваць поўны геном каранавіруса.**
- Лазню № 1 у Мінску адкрыюць пасля рэканструкцыі да канца года.

ISSN 1990 - 763X

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

«Самая страшная эпідэмія ў свеце — гэта паніка»

Учора ў Палацы Незалежнасці адбылася рабочая нарада, прысвечаная эпідэміялагічнай сітуацыі ў краіне. Але фармат яе быў адмысловы, набліжаны да круглага стала: удзельнікі не атрымлівалі даручэнні, а выказвалі свае меркаванні і прапановы, а Прэзідэнт кожнага ўважліва выслухоўваў і, дарэчы, усе прапановы падтрымаў.

Фота БелТА.

ХАЛОДНЫ РОЗУМ ВА ЎМОВАХ ПСІХОЗУ

Першапачаткова сустрэча нават задумвалася без удзелу міністра аховы здароўя, бо кіраўнік дзяржавы добра ведае і яго пазіцыю, і тое, як зараз працуе сістэма. Аляксандр Лукашэнка жадаў выслухаць меркаванні менавіта экспертаў — вірусолагаў і эпідэміёлагаў — пра тое, што яшчэ трэба зрабіць, каб не дапусціць непажаданага развіцця падзей у сувязі з распаўсюджаннем каранавіруса COVID-19.

І ўсё ж такі на нарадзе быў і міністр Уладзімір Каранік (ён сам настаяў, расказаў потым Аляксандр Лукашэнка), і кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Ігар Сергеенка, і дзяржаўны сакратар Савета Бяспекі Андрэй Раўкоў, а таксама спецыялісты ў галіне эпідэміялогіі, рэанімацыі і дыягностыкі.

СТАР. 2

На слыху

Прадстаўнікі туріндустрыі:

«Ніколі раней з такімі выклікамі мы не сутыкаліся»

Зараз за мяжой застаецца каля шасці тысяч беларускіх турыстаў, якія выехалі ў складзе арганізаваных груп. Прычым каля чатырох тысяч з іх у Егіпце, і каля дзвюх тысяч — у іншых краінах. Такія звесткі прыводзіць Міністэрства спорту і турызму. Пры гэтым пасля закрыцця граніц праблемы з вяртаннем у Беларусь узніклі пераважна ў тых нашых суайчыннікаў, хто прылятае праз маскоўскі аэрапорт «Унукава».

— Працуюць прадстаўнікі нашых пасольстваў, функцыянуе сістэма транзітных калідораў. Задача вяртання нашых турыстаў з Егіпта вырашана. Праблема ўзнікла з турыстамі, якія адправіліся на адпачынак з расійскім тураператарам «Бібліа Глобус». Магчыма, ён імкнецца найперш вывезці расійскіх грамадзян і з гэтай прычыны не бярэ нашых. Мой суб'ектыўны прагноз такі, што на працягу найбліжэйшага тыдня ўсе нашы турысты вернуцца дадому, — пракаментаваў сітуацыю **старшыня праўлення Рэспубліканскага саюза туріндустрыі Філіп ГУЛЫЙ.** — Тым больш, што страшных карцінак з натоўпамі ў аэрапорце няма. Многія з турыстаў працягваюць жыць у атэлях, у іх ёсць харчаванне, сонца і мора.

З 16 сакавіка Рэспубліканскі саюз туріндустрыі стварыў аператыўны штаб для своечасовага інфармавання аб сітуацыі на турыстычным рынку. Інфармацыя пра турыстаў, якія не могуць вярнуцца ў Беларусь, збіраецца і праз Тэлеграм-канал.

— Мы сутыкнуліся з сітуацыяй, што (з-за закрыцця граніц. — **«Зв».**) адбываецца ануляванне віз, білетаў, у людзей узнікае паніка. Мы збіраем інфармацыю, у тым ліку і ў нашым Тэлеграм-канале, пра турыстаў, якія не могуць вярнуцца, і накіроўваем яе ў ведамствы, што непасрэдна займаюцца іх вяртаннем, — расказаў **кіраўнік антыкрызіснага штаба турагентаў Яўген АЛЬШАНСКІ.**

Паводле звестак Рэспубліканскага саюза туріндустрыі, на Шры-Ланцы знаходзіцца каля 70 нашых грамадзян, якія маюць праблемы з вылетам, на Гаа — 96.

Праблемы цяпер адчувае і ўязны турызм. Прычым, на думку экспертаў, яны глабальныя і будуць мець доўгія наступствы.

СТАР. 3

Сезонны інтарэс

З БЯРОЗАВІКАМ БУДЗЕШ — СІЛЫ ЗДАБУДЗЕШ

Фота БелТА.

З-за анамальных кліматычных умоў сёлета сезон нарыхтоўкі карыснага напою стартаваў на некалькі тыдняў раней, чым звычайна. Лясгасы паўднёвых рэгіёнаў пачалі яго збор у канцы лютага, цяпер работа актыўна ідзе па ўсёй краіне. У тым ліку і на ўчастках Старобінскага лясгаса, дзе на сёння сабрана звыш тысячы тон бярозавіку. Туды і наведалася карэспандэнт «Звязды».

— Зіма была вельмі цёплая, што, безумоўна, паўплывала на перыяд пачатку руху соку. Першым стаў кляновы, але яго мы ў прамысловых аб'ёмах не нарыхтоўваем. Затым у канцы лютага — пачатку сакавіка пайшоў і бярозавік. Гэта самы ранні пачатак збору напою за апошнія гады, — расказаў **дырэктар Старобінскага лясгаса Антон РАМАНОЎСКІ.**

Спецыялісты па лесе чакалі, што пасля бясснежнай зімы «сакавіты сезон» можа завяршыцца за два-тры тыдні. Але з улікам начных замаразкаў нарыхтоўка бярозавага соку будзе цягнуцца даўжэй.

СТАР. 4

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!

Ідзе падпіска на «Звязду» на II квартал 2020 года

ПІШАМ ПРА ТОЕ, ШТО САПРАЎДЫ ВАЖНА

«Самая страшная эпідэмія ў свеце — гэта паніка»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Калі паспрабаваць коратка сфармуляваць пазіцыю кіраўніка дзяржавы па сітуацыі, якая складваецца з-за пандэміі каранавіруса, яна будзе выглядаць наступным чынам: спрашчаць яе нельга, але і залішнія — істэрычныя — рухі рабіць не варта, бо ў лепшым выпадку яны не дадуць плёну, а ў горшым — нашкодзяць.

«Абмеркаваць эпідэміялагічную абстаноўку асабліва важна ва ўмовах каранавіруснага псіхозу, — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. — Я цалкам упэўнены, што ***мы можам пацярпець больш ад панікі, чым ад самога віруса***. Гэта мяне больш за ўсё хвалюе. ...Цывілізаваны свет увогуле нібы звар'яцеў... Ужо і палітыкі выкарыстоўваюць у сваіх інтарэсах гэтыя працэсы. У залежнасці ад таго, што ў якой канкрэтнай краіне адбываецца».

Пры гэтым ***ёсць у такой сітуацыі і несумненная карысць, лічыць Аляксандр Лукашэнка. Яна ў тым, што мабілізавалася ўся сістэма аховы здароўя, асабліва эпідэміялагічная служба, пра якую ў звычайных умовах забываюцца***.

«Добра, што мы захавалі гэту сістэму з савецкіх часоў і не страцілі вас, — звярнуўся Прэзідэнт да прысутных спецыялістаў. — Гэты псіхоз прымусіў нас страпянуцца і ў гэтым кірунку папрацаваць».

Аляксандр Лукашэнка паведаміў, што з беларускімі медыкамі цяпер дзеляцца сваімі парадамі кітайскія калегі, якія набылі багаты вопыт у барацьбе з COVID-19. Што датычыцца аб'яўлення Сусветнай арганізацыяй аховы здароўя пандэміі, то, на думку беларускага лідара, гэта не мае вялікага значэння для нашай краіны, якая як працавала, так і працуе, павялічваючы намаганні па барацьбе з вірусамі ўвогуле, а не толькі з COVID-19.

«УСЕ ПАВІННЫ БЫЦЬ ДОМА. У БЯСПЕЦЫ»

Што датычыцца закрыцця расійскай граніцы, то Прэзідэнт лічыць гэта непрадуманым, дарэмным і нават шкодным крокам.

«Я яшчэ раз хачу паўтарыць, і гэта ўжо пацвярджаецца: глупства абсалютнае і несусветнае, — сказаў ён. — ***Гэта ніяк не абараняе Расію, тым больш у сітуацыі, калі граніцы закрываюць выбарачна*** — недзе закрылі, недзе адкрылі. Памятаеце, як з граніцай з Кітаем на Далёкім Усходзе было? Закрылі, праз трое сутак пачаўся дэфіцыт прадуктаў з Кітая. У выніку прыадкрылі. Вакханалія цэлая! Але гэта іх справа. Людзі ацэняць усё, што адбываецца ў нас з закрыццём граніц».

На думку беларускага лідара, у выніку ў свеце штучна створаная сітуацыя, калі чалавек, які апынуўся за мяжой, не можа патрапіць дадому. Гэта датычыцца не толькі беларусаў, але і расіян, якія цяпер знаходзяцца ў Польшчы і не могуць вярнуцца на радзіму.

Аляксандр Лукашэнка даў персанальнае даручэнне кіраўніку сваёй Адміністрацыі дапамагчы расіянам, а таксама распарадзіўся здзейсніць усе намаганні, каб дадому ў найбліжэйшы час змаглі вярнуцца беларусы.

НАСЦЯРОЖАНАСЦЬ ДАПАМАГАЕ

Прэзідэнт упэўнены, што для Беларусі неактуальнае пытанне пра няздольнасць медыцынскай сістэмы справіцца з наплывам інфіцыраваных каранавірусам хворых.

«У Італіі паміраюць у асноўным старыя, якім своечасова не аказалі дапамогу. У нас зусім не так. ***Усе, хто быў за мяжой, — на медыцынскім кантролі. Пры самым малым падазрэнні тэсціруем, калі лабараторна пацверджана, адразу ўсе кантакты знаходзім і ізалюем»***, — назваў ён прынцыповае, на яго думку, адрозненне падыходу да выяўлення хворых у Беларусі.

Кіраўнік дзяржавы звярнуў увагу на тое, што сёлета, нягледзячы на напружаную сітуацыю ў свеце ў сувязі з каранавірусам, у Беларусі зарэгістравана ў цэлым на паўтары тысячы менш захворванняў, звязаных з дыхальнай сістэмай, у прыватнасці, значна менш адбылося лятальных выпадкаў з-за пнеўманіі.

«У канцы зімы — пачатку вясны ў Беларусі, як і ва ўсім свеце, ідзе пад'ём сезонных інфекцый, — канстатаваў Аляксандр Лукашэнка. — Размова ў гэтым выпадку не пра каранавірус, а пра прывычныя для нас вострыя рэспіраторныя інфекцыі, у тым ліку грып. Самае небяспечнае, што можа адбыцца, — пнеўманія. У мяне на стале параўнальная леташняя і сёлетняя статыстыка па колькасці смяротных выпадкаў ад пнеўманіі. Факт: за 2019 год у студзені—лютым было 196 смерцяў ад пнеўманіі, за студзень—люты гэтага года пры такім псіхозе і іншых хваробах у нас загінула 138. Пры гэтым, асабліва падкрэсліваю, ***ніводнай смерці пры пацверджанай каранавіруснай інфекцыі на тэрыторыі нашай краіны сёння няма»***.

Такім чынам, ***беларускі лідар запатрабаваў ад Міністэрства аховы здароўя прыкласці ўсе намаганні, каб не толькі на каранавірус, а любых захварэлых было як мага менш і ўсе яны выздаравелі***. «Ад любой інфекцыі, ад любой — не толькі каранавіруснай!» — акцэнтаваў увагу Прэзідэнт.

СТРАХ — ШКОДЗІЦЬ

Кіраўнік дзяржавы крытычна выказаўся пра ўвядзенне каранціну ў БНТУ і пра ідэю перанесці школьныя канікулы. Ён лічыць гэтыя захады празмернымі і нават шкоднымі.

«Я катэгарычна забараніў без майго ведама нешта закрываць, нешта адмяняць, — сказаў Прэзідэнт. — Вы павінны лячыць людзей. Таму ніякіх пераносаў, напрыклад, канікул у школе. Баяцца бацькі — няхай не пускаюць. Але, на шчасце, сярод дзяцей няма хворых».

Пры гэтым дзеці могуць пераносіць вірус, а ў выпадку датэрміновых канікул яны вымушана паедуць да сваіх бабуль і дзядуль і падвергнуць іх рызыцы інфіцыравання, што для старых якраз вельмі небяспечна.

Больш важна прывучыць дзяцей да элементарных правіл гігіены. Падобная логіка — і адносна закрыцця меж. Наўрад ці вялікі сэнс іх закрываць, іншая рэч — прадухіліць распаўсюджанне занесенай з-за мяжы інфекцыі.

«Кантроль на граніцы мы паслабляць не павінны, — падкрэсліў Прэзідэнт. — Мне дзяржсакратар штораніцы дакладвае аб абстаноўцы на мяжы. Вялізная колькасць расіян перасоўваецца цераз нашу заходнюю граніцу ў Расію. Ні ў якім выпадку не чапайце! Яны вязуць грузы для Расіі — няхай вязуць. Мы забяспечваем ім тры калідоры — Украіна, Польшча, Прыбалтыка, — па якіх фуры перасякаюць нашу краіну. Трэба ім заправіцца — мы вызначаем пункты, дзе яны будуць запраўляцца, адпачываць і харчавацца».

Прэзідэнт ухваліў ініцыятыву Міністэрства аховы здароўя па размежаванні патокаў рабочых і студэнтаў у грамадскім транспарце. Падтрымаў ён і настрой у грамадстве на самаізаляцыю пры любых прыкметах рэспіраторных інфекцый.

«Людзям з прыкметамі інфекцыі трэба раіць заставацца дома, і асабліва — старым. ***Трэба так мабілізаваць нашы сацыяльныя службы, каб дапамагалі тым, каму дзеці дапамагчы не могуць***. А такіх хапае, — сказаў Прэзідэнт. — Таму ***трэба старымі цяпер апекавацца. Вось гэта для нас вельмі, вельмі важна — каб яны не пацярпелі»***.

Аляксандр Лукашэнка папрасіў экспертаў паведаміць яму, што яшчэ трэба зрабіць, каб актывізаваць медыцынскую сістэму ў супрацьстаянні з інфекцыямі, у тым ліку з новай.

Па словах Прэзідэнта, цяпер у краіне хапае медыцынскіх масак, дастаткова ахоўных медыцынскіх касцюмаў. Але рэспіратараў можа не хапіць. І гэта абурыла кіраўніка дзяржавы. Ён даручыў за тыдзень наладзіць у Беларусі вытворчасць рэспіратараў.

«Хвалімся ўсюды, што мы — ІТ-краіна, а няшчасныя гэтыя «наморднікі» не можам вырабіць! ***Каб за тыдзень урад прыняў адпаведнае рашэнне!*** Калі няма станка — не праблема яго набыць. Дрэнна, што ў Беларусі іх няма. Яны нам спатрэбяцца заўсёды, не толькі з каранавірусам».

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.

● Кампетэнтна

Айчынныя сістэмы дыягностыкі каранавіруса выкарыстоўваюцца ўжо з 23 студзеня, расказала журналістам **загадчык лабараторыі грыпу і грыпападобных захворванняў РНПЦ эпідэміялогіі і мікрабіялогіі Наталля ШМЯЛЁВА.** Іх даставернасць пацверджана нямецкай клінікай-партнёрам СААЗ. Па інфармацыі загадчыцы лабараторыі, цяпер у краіне праводзіцца дыягностыка з выкарыстаннем трох тыпаў тэст-сістэм: айчынных, расійскіх і дыягнастычных тэст-сістэм, якія былі пастаўленыя СААЗ. Айчынная тэст-сістэма зараз праходзіць рэгістрацыю, пры гэтым яна мае папярэдні дазвол на выкарыстанне, што дазваляе зрабіць дыягностыку даступнай ва ўсіх рэгіёнах краіны.

Зберагчы старых ад заражэння каранавірусам дапаможа дастаўка лекаў з аптэк на дом. Гэтае пытанне прапрацоўвае Міністэрства аховы здароўя, паведаміў **кіраўнік ведамства Уладзімір КАРАНІК.** «Калі ёсць электронны рэцэпт, не трэба папяровага носьбіта. Гэта значыць, пенсіянер можа патэлефанаваць у паліклініку, і доктар выпіша электронны рэцэпт. Безрэцэптурныя прэпараты можна будзе замовіць па тэлефоне альбо па інтэрнэце з дастаўкай на дом. Мы прапрацоўваем гэтую сістэму», — сказаў міністр. Пакуль гаворка ідзе пра аптэкі, якія маюць стацыянарную сетку, у прыватнасці, дыстрыб'ютары «Фармацыя». Магчыма, да гэтай сістэмы змогуць далучыцца і іншыя буйныя сеткі.

У беларускіх медыкаў распрацавана некалькі сцэнарыяў рэагавання на распаўсюджанне каранавіруса. Яны гатовыя працаваць пры адзінкавых, групавых і масавых захворваннях. Па словах **загадчыка аддзела анестэзіялогіі, рэанімацыі і інтэнсіўнай тэрапіі Мінскага навукова-практычнага цэнтра хірургіі, транспланталогіі і гематалогіі Аляксандра ДЗЯДЗЬКО,** галоўнае — не дапусціць усплёску інфіцыравання і масавага паступлення пацыентаў у рэанімацыю, як у Італіі: такога не вытрымае ніводная сістэма.

● У тэму

Па інфармацыі Міністэрства аховы здароўя на 17 сакавіка 2020 года ўсяго зарэгістраваны 51 выпадак лабараторнага пацвярджэння COVID-19 у Беларусі. Большая частка пацыентаў не мае прыкмет захворвання, шэсць ужо выпісаныя, хутка могуць быць выпісаныя яшчэ 11.

У рамках санітарнага кантролю на граніцах Беларусі на 17 сакавіка былі вызначаныя 242 чалавекі з сімптомамі вострай рэспіраторнай віруснай інфекцыі, якія знаходзіліся раней у краінах з высокім узроўнем захваральнасці на COVID-19: у КНР — 97 чалавек, у Італіі, Паўднёвай Карэі, Іране — 145 чалавек. Гэтыя людзі шпіталізаваныя ў інфекцыйныя стацыянары, ім аказаная неабходная медыцынская дапамога, праведзены лабараторныя даследаванні. Наяўнасць каранавіруса ні ў кога не пацвердзілася.

Міністэрства аховы здароўя інфармуе, што пад актыўнае медыцынскае назіранне трапляюць усе грамадзяне, якія прыбылі з краін, дзе небяспечная сітуацыя з COVID-19. На 17 сакавіка працягваецца медыцынскае назіранне за амаль дзвюма тысячамі грамадзян. За амаль трыма тысячамі двухтыднёвае медыцынскае назіранне завершана, яны здаровыя.

Пры гэтым медыкі бесперапынна сочаць за ўсімі студэнтамі, якія вяртаюцца з КНР, Італіі, Ірана, Паўднёвай Карэі. Таксама арганізавана назіранне за рабочымі, якія прыбываюць з КНР.

Міністэрства аховы здароўя пашырыла пералік краін з дрэннай эпідэміялагічнай сітуацыяй, уключыўшы ў яго таксама Францыю, Германію, Іспанію, Польшчу і Чэхію.

Для ўдасканалення супрацьэпідэміялагічных мерапрыемстваў Міністэрства аховы здароўя прапануе шэраг мер.

- Арганізаваць транзітныя калідоры для вялікагрузнага транспарту і расійскіх грамадзян, якія следуюць праз нашу краіну, з дакладным вызначэннем месцаў, дзе тыя могуць спыняцца для запраўкі, адпачынку і харчавання, з арганізацыяй у гэтых месцах санітарна-кантрольных пунктаў для назірання і наступнай дэзінфекцыі.
- Скараціць інтэрвалы руху грамадскага транспарту ў гадзіны пік.
- Змясціць час пачатку заняткаў у ВНУ на больш пазнейшы час для раздзялення патокаў пасажыраў, якія едуць на работу і вучобу.
- Актывізаваць работу сацыяльных службаў, накіраваную на задавальненне патрэб пажылых людзей і інвалідаў без выхаду з дому.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

Ухань да канца сакавіка можа вызваліцца ад каранавіруса

Горад Ухань, адміністрацыйны цэнтр кітайскай правінцыі Хубэй, які лічыцца эпіцэнтрам распаўсюджання каранавіруса COVID-19, можа цалкам ачысціцца ад інфекцыі да канца бягучага месяца. Каранцін у горадзе можа быць паступова зняты, лічыць адзін з вядучых вірусолагаў КНР Лі Ланьцзюань, калі на працягу 14 дзён запар ва Ухані не будзе зарэгістравана ніводнага новага выпадку заражэння. «Пасля таго як блакада горада будзе аслаблена, мы ўсё яшчэ павінны будзем строга выконваць дзеянні, накіраваныя на кантроль над вірусам, каб прадухіліць магчымыя новыя ўспышкі», — дадаў ён. Па стане на раніцу 19 сакавіка, у мацерыковым Кітаі за мінулыя суткі не зарэгістравана ніводнага выпадку заражэння каранавірусам. Усе 34 выяўленыя новыя інфіцыраваныя — людзі, якія прыбылі з-за мяжы. У той жа час у Хубэі зафіксавана восем выпадкаў смяротнага зыходу сярод тых, хто захварэў раней, з іх шэсць — ва Ухані. Усяго са снежня 2019 года ў гэтым горадзе колькасць інфіцыраваных каранавірусам склала 40765 чалавек, памерла 2496.

Улады Ірана амніставалі 10 тысяч зняволеных

Вызваленне адбылося ў рамках ухваленай духоўным лідарам і кіраўніком краіны Алі Хаменеі амністыі ў гонар Наўруза, Новага года па іранскім календары, які настаў у ноч на 20 сакавіка. Пра гэта заявіў афіцыйны прадстаўнік Вярхоўнага суда Ірана Галям Хасейн Ісмаілі. Больш за палову гэтых зняволеных асуджаныя па справах, якія прадугледжваюць пагрозу бяспецы краіны. Ісмаілі дадаў, што «ўсе, хто трапляе пад амністыю, будуць вызваленыя з турмы».

У Брытанскім музеі назвалі самую цікавую знаходку

Самай каштоўнай знаходкай за мінулы год стала старажытная брошка, узрост якой складае каля 1100 гадоў. Рарытэт выявілі ў Норфалку, паведаміла The Guardian. Брошка стала самай каштоўнай з усіх 1311 скарбаў, знойдзеных на тэрыторыі Англіі, Уэльса і Паўночнай Ірландыі пры дапамозе металадэтэктараў. Яна ўпрыгожаная раслінными матывамі, геаметрычнымі формамі і выявамі жывёл, у тым ліку драконаў і сабак. «Гэта дзіўны прыклад англасаксонскага мастацтва таго часу. Вонкава яна больш падобная на прадмет віктарыянскай эпохі», — расказаў прадстаўнік музея. Ён дадаў, што брошку можна насіць «хоць сёння», бо яна ў вельмі добрым стане. Акрамя таго, летась былі знойдзеныя залаты бранзалет бронзавага веку і манета, з дапамогай якой удалося даведацца больш пра рымскага імператара-ўзурпатара Караузія.

«Ніколі раней з такімі выклікамі мы не сутыкаліся»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

— Пакуль у краінах дзейнічае каранцін, турысты да нас не едуць — адменена 100 % тураў. Ёсць дзелавыя паездкі, але і там адчуваецца спад на 70 %. Баяцца ехаць і расіяне, хоць забароны на ўезд для іх няма. На гэтыя выхадныя з Санкт-Пецярбурга запланавана прыбыццё двух аўтобусаў — у адным 42, у другім 46 чалавек. На сёння ў іх засталося 21 і 18 турыстаў. Нават калі ўсе яны паедуць, для турфірмы гэта стратна... Такая сітуацыя з Расіяй працягнецца дзейнічаць да 1 мая, — тлумачыць Філіп Гулый. — Нават калі ўсе абмежаванні будуць зняты, спатрэбіцца час на аднаўленне, таму першых турыстаў мы пабачым толькі праз месяц пасля адкрыцця граніц.

Расіяне займалі істотную долю ў структуры ўязнога турызму. Эксперты пацвярджаюць, што раней штодзень афармляліся сотні заявак на туры выхаднога дня і летні адпачынак. Нягледзячы на тое, што забароны на выезд у Беларусь для расіян няма, з закрыццём граніцы іх плынь істотна зменшылася і ледзь не зусім знікла.

— Сітуацыя была не вельмі добрая з пачатку сакавіка, а з гэтага панядзелка яна яшчэ пагоршылася. Турысты, якія збіраліся да нас, не прыехалі і патрабуюць вярнуць грошы, — кажа Філіп Гулый.

— Звычайна выплаты турыстам ажыццяўляюцца з абаротных сродкаў кампаній. Цяпер, калі масава адмяняюцца ўсе туры, абаротных сродкаў няма, — тлумачыць **начальнік філіяла «Белінтурыст» РУП «Цэнтркурорт» Аляксей СТРЭЛЬЧАНКА.**

— Вы заплацілі турагенцтву, яно — тураператару, а той, у сваю чаргу, пералічыў грошы гасцініцы, якая заплаціла з іх падаткі, аплаціла хімчыстку — сродкі працуюць у беларускай эканоміцы. Тое самае адбываецца, калі грошы пералічаны замежнаму гатэлю. Просіш вярнуць сродкі — нам адказваюць, што, або зараз на каранціне і трэба чакаць, або пераносьце тур, або грошы «згарэлі», бо вы не прыехалі. Механізму ўзаемадзеяння і вяртання грошай у такой сітуацыі няма, — дадае Філіп Гулый.

Прадстаўнікі турыстычнай сферы тлумачаць, што ў такім выпадку лепш перанесці тур на пазнейшы тэрмін, чым чакаць, пакуль вам змогуць вярнуць грошы. Калі ж кампанія абанкруціцца (што цалкам імаверна ва ўмовах, у якія трапіла турыстычная галіна), сваіх грошай вы ўвогуле не ўбачыце.

— З 2014 года турызм пачаў выходзіць у Беларусі на пазіцыі перспектыўнага драйвера ў сферы паслуг. Мы імкнёмся трымаць удар, але ніколі раней з такімі выклікамі не сутыкаліся. Негатыўныя наступствы будуць значныя, і неабходны кампенсацыйныя меры, каб галіна паднялася з каленяў, — падкрэсліў Аляксей Стрэльчанка. Ён нагадаў, што ў Беларусі каля 1300 турыстычных кампаній, 600 гасцініц, а ў галіне працуе каля 50 тысяч чалавек.

Сярод мер, якія прапануе Рэспубліканскі саюз турындустрыі, — даванне суб'ектам турыстычнай дзейнасці права адтэрміноўкі па выкананні сваіх абавязацельстваў, увядзенне падатковых канікул, зніжэнне арэнднай платы, аўтаматычнае падаўжэнне замежным грамадзянам віз да 31 снежня бягучага года і выдача новых без аплаты і іншыя.

— Галоўны ўдар (сітуацыяй з распаўсюджваннем каранавіруса. — **«Зв.»**) будзе нанесены па эканоміцы. Мы павінны паглядзець на тыя галіны, якія звязаны з экспартам і пацерпяць мацней за астатня, — гэта турызм, авіяперавозкі, гасцінічны комплекс, магчыма, чыгуначныя перавозкі. У нас няма вялікіх рэзерваў, але мы павінны распрацаваць комплекс мер, каб падтрымаць гэтыя галіны. 24 сакавіка на пасяджэнні нашай камісіі (па міжнародных справах. — **«Зв».**) гэтае пытанне будзе разгледжана, — расказаў **старшыня Пастаяннай камісіі па міжнародных справах Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Андрэй САВІНЫХ.**

Алена КРАВЕЦ.

Блізкая ўлада

Званіце з праблемамі і пытаннямі

Традыцыйна па суботах аблвыканкамамі і Мінскім гарвыканкамам праводзяцца прамыя лініі ў мэтах павышэння эфектыўнасці работы са зваротамі грамадзян і юрыдычных асоб, выкаранення фактаў бюракратызму і цяганіны, папяратворчасці, а таксама для аператыўнага вырашэння праблемных пытанняў, якія ўзнікаюць у людзей.

Тэлефонныя лініі ў суботу, 21 сакавіка, з 9.00 да 12.00 правядуць:

- першы намеснік старшыні Брэсцкага аблвыканкама Валерый Васілевіч РАБКАВЕЦ. Тэл. 8 016 221 31 21;
- намеснік старшыні Віцебскага аблвыканкама Уладзімір Пятровіч ПЕНІН. Тэл. 8 021 222 22 22;
- намеснік старшыні Гомельскага аблвыканкама Уладзімір Уладзіміравіч ГАРБАЧОЎ. Тэл. 8 023 233 12 37;
- старшыня Гродзенскага аблвыканкама Уладзімір Васілевіч КРАЎЦОЎ. Тэл. 8 015 273 56 44;
- старшыня Магілёўскага аблвыканкама Леанід Канстанцінавіч ЗАЯЦ. Тэл. 8 022 250 18 69;
- старшыня Мінскага абласнога Савета дэпутатаў Наталля Віктараўна ЯКУБІЦКАЯ. Тэл. 8 017 500 41 60;
- кіраўнік спраў Мінскага гарвыканкама Ганна Мар'янаўна МАТЭЛЬСКАЯ. Тэл. 8 017 222 44 44.

Фінансавая палітыка

Нацбанк растлумачыў, чаму ў абменніках долараў можа і не быць

Учора ўвечары прэс-служба галоўнага фінансавага рэгулятара краіны падрыхтавала тлумачэнні «аб бягучай сітуацыі на фінансавым рынку краіны».

У ёй, у прыватнасці, гаворыцца, што за апошнія дні валацільнасць (зменлівасць. — **«Зв.»**) на глабальных фінансавых рынках значна ўзрасла. У гэтых умовах павысіўся попыт на замежную валюту на ўнутраным валютным рынку краіны. Гэта адбілася на дынаміцы курса беларускага рубля ў адносінах да замежных валют.

У мэтах абмежавання рызык забеспячэння фінансавай стабільнасці, звязаных з павышанай валацільнасцю курса, Нацбанк праводзіў валютныя інтэрвенцыі ў дадатковых аб'ёмах. У цэлым рэгулятар рэалізуе курсавую палітыку ў рэжыме плаваючага курса, які дапускае правядзенне валютных інтэрвенцый у абмежаваных аб'ёмах з мэтай згладжвання рэзкіх ваганняў курса. У той жа час Нацбанк працягне ажыццяўляць маніторынг сітуацыі і пры неабходнасці будзе прымаць аператыўныя меры рэагавання.

У мэтах павышэння магчымасцяў банкаў па захаванні фінансавай падтрымкі рэальнага сектара эканомікі ва ўмовах павышанага ўплыву знешніх негатыўных фактараў праўленнем Нацбанка было прынята рашэнне аб прымяненні контрцыклічных мер, звязаных са змякчэннем шэрагу прудэнцыяльных (асцярожных. — **«Зв.»**) патрабаванняў.

А цяпер галоўная навіна для насельніцтва. У цяперашні час у сувязі з распаўсюджаннем эпідэміі каранавіруса і мер, што прымаюцца па абмежаванні ўезду замежных грамадзян, міжнародныя авіякампаніі значна скарацілі колькасць палётаў, што істотна ўскладніла перасоўванне грузаў паміж краінамі.

З прычыны гэтага зараз еўрапейскія банкі і фінансавыя арганізацыі, якія аказваюць паслугі па продажы наяўных долараў на еўрапейскім рынку, маюць цяжкасці з дастаўкай валюты са Злучаных Штатаў Амерыкі. Гэта прывяло да дэфіцыту наяўных долараў ЗША ў краінах рэгіёна на фоне павелічэння попыту на іх, абумоўленага высокай валацільнасцю на сусветных фінансавых рынках.

У сувязі з гэтым у абменных пунктах і касах банкаў можа назірацца часовы недахоп наяўных долараў. Пры гэтым адсутнічаюць абмежаванні па куплі або продажы долараў у безнаяўнай форме. **Акрамя таго, у касах банкаў у дастатковай колькасці знаходзіцца іншая замежная валюта (напрыклад, еўра).**

У існуючых умовах банкаўскай сістэмай краіны будуць прымацца неабходныя меры па забеспячэнні своечасовага і якаснага аказання грамадзянам і суб'ектам гаспадарання ўсяго комплексу банкаўскіх паслуг, гаворыцца ў заяве Нацбанка.

Сяргей КУРКАЧ.

НЕ ДЗЕЛІМ НА СВАІХ І ЧУЖЫХ

Да 27 сакавіка ўсіх беларускіх турыстаў вывезуць з Егіпта

Пра гэта заявіў на прэс-канферэнцыі міністр спорту і турызму Сяргей КАВАЛЬЧУК. У Егіпет будуць накіраваны самалёты «Белавія», якія забяруць суайчыннікаў згодна з графікам. У гэтай краіне знаходзіліся на адпачынку каля шасці тысяч беларусаў.

Як расказаў Сяргей Кавальчук, ва ўрадзе створана рабочая група па вяртанні беларусаў з-за мяжы. Вырашаюцца пытанні транспарціроўкі нашых грамадзян па двух напрамках: з Егіпта і краін далёкай дугі (Інданезія, В'етнам, Мексіка, Тайланд, Куба, Індыя і іншыя).

Па апошнім маршруце лагістыка турыстаў на адпачынак і адтуль была арганізавана праз маскоўскія аэрапорты. «Галоўнае пытанне, якое нам неабходна вырашыць, — гэта дастаўка беларусаў з далёкай дугі. Сёння яны не могуць трапіць на борт расійскіх авіякампаній у сувязі з прыняццем рашэння Расійскай Федэрацыяй аб абмежаванні ўезду грамадзян Рэспублікі Беларусь. Ідуць перагаворы аб магчымасці такой перавозкі расійскімі авіякампаніямі. У турыстаў ёсць білеты на адпаведныя рэйсы. З Масквы авіякампанія «Белавія» гатова іх забраць і прывезці на радзіму», — сказаў **міністр транспарту і камунікацый Аляксей АЎРАМЕНКА.**

Калі праз аэрапорт «Шарамецьева» і «Дамадзедава» беларусы маглі паляцець на радзіму і пасля закрыцця граніц, то з аэрапорта «Унукава» такой магчымасці не было. Па словах Аляксея Аўраменкі, ва «Унукаве» вылету ў Мінск чакаюць каля 100 чалавек. Беларускі борт для іх ужо гатовы, і ў найбліжэйшы час ён адправіцца за грамадзянамі. Схема дзеянняў па транспарціроўцы наступная — фарміруюцца групы, Мінспорту робіць адпаведную заяўку і накіроўвае самалёт ва «Унукава». «Гэта чартарная перавозка. Па меры гатоўнасці груп мы будзем перавозіць усіх людзей, якія сабраліся ў аэрапорце «Унукава», — удакладніў Аляксей Аўраменка. Білеты турысты, якія маюць ранейшыя дамоўленасці з турфірмамі, купляць не будуць.

Першы борт павінен адправіцца ўжо ў чацвер, пасля каардынацыі дзеянняў з расійскім бокам.

Дарэчы, чыгуначныя зносіны з Масквой не спынены, але нашых грамадзян на гэтых цягніках у Расію не пускаюць.

Андрэй Дапкюнас, намеснік міністра замежных спраў Беларусі, паведаміў, што кіраўнік ведамства Уладзімір Макей у чацвер звярнуўся па тэлефоне да свайго расійскага калегі з просьбай вырашэння некаторых праблем вяртання суайчыннікаў і абмеркаваў узаемадзеянне ў гэтых пытаннях.

Беларускі бок па даручэнні Прэзідэнта гатовы арганізаваць выезд з Польшчы грамадзян Расіі. Па словах Андрэя Дапкюнаса, зваротаў няшмат — 5—7 на дзень. «Сапраўды крытычная сітуацыя, па словах расійскіх калег, была некалькі дзён таму. Толькі ўчора ўвечары пасол Расіі звярнуўся да нашага пасла з гэтай праблемай. Там сітуацыя не крытычная, — адзначыў намеснік міністра. — Галоўны сэнс у тым, што незалежна ад вастрыні сітуацыі беларускія ўлады і беларускія замежныя ўстановы гатовы ставіцца да расійскіх грамадзян як да сваіх».

Міністр спорту і турызму таксама паведаміў, што ніякіх рашэнняў аб адмене Алімпіяды ў Токіа не было прынята.

Усе краіны рыхтуюцца да спаборніцтваў, і Беларусь не выключэнне. «На сёння 404 спартсмены ў нас знаходзяцца за мяжой і ажыццяўляюць такую падрыхтоўку, — расказаў Сяргей Кавальчук. — І ў розныя перыяды таксама будуць вяртацца. У дачыненні да спартсменаў, якія вяртаюцца з вучэбна-трэніровачных збораў, у нас таксама распрацаваны комплекс мер».

Марыя ДАДАЛКА.

Будзь у курсе!

АПОШНІЯ ЦЯГНІКІ Ў РАСІЮ

Да 0.00 гадзін 23 сакавіка міжнародныя пасажырскія цягнікі, якія курсіруюць у зносінах з Масквой і Санкт-Пецярбургам, будуць прытрымлівацца дзеючага графіка, паведамілі ў прэс-цэнтры Беларускай чыгункі.

Там нагадалі, што, у адпаведнасці з распараджэннем урада Расійскай Федэрацыі ад 16 сакавіка № 635-р, з 0.00 гадзін 18 сакавіка да 0.00 гадзін 1 мая часова абмяжоўваецца ўезд у Расійскую Федэрацыю замежных грамадзян і асоб без грамадзянства, у тым ліку якія прыбываюць з тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, а таксама грамадзян Рэспублікі Беларусь. З улікам гэтага магістраль перакануча просіць пасажыраў прымаць да ўвагі гэты факт пры планаванні паездкі міжнароднымі пасажырскімі цягнікамі з Беларусі ў Расію.

У прэс-цэнтры звярнулі ўвагу, што з Расійскай Федэрацыі ў Рэспубліку Беларусь грамадзяне нашай краіны могуць ехаць міжнароднымі пасажырскімі цягнікамі без абмежаванняў. У сувязі з распараджэннем урада Расійскай Федэрацыі ад 16 сакавіка № 635-р і паведамленнем ААТ «Расійскія чыгункі» да зняцця абмежаванняў з абарачэння выключаюцца:

з 20 сакавіка цягнік № 64/63 Мінск — Новасібірск;

з 22 сакавіка цягнікі № 308/307 Баранавічы — Саратаў, № 390/389 Мінск — Анапа, № 236/237 Мінск — Масква — Мінск, № 221/222 Брэст — Масква і Мінск — Масква;

з 23 сакавіка цягнікі № 66/65 Мінск — Мурманск, № 76/75 Гомель — Масква, № 302/301 Мінск — Адлер, № 104/103 Брэст — Новасібірск, № 150/149 Мінск — Мінеральныя Воды, № 328/327 Мінск — Казань, № 134/133 Мінск — Архангельск.

Сяргей РАСОЛЬКА.

З БЯРОЗАВІКАМ БУДЗЕШ — СІЛЫ ЗДАБУДЗЕШ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

— Яна праходзіць на ўчастках ляснога фонду не раней чым за пяць гадоў да ўзросту сталасці лесу, — расказала **ляснічы Чырвонаслабодскага доследна-вытворчага лясніцтва Алена ВАРАШКЕВІЧ.** — Нарыхтоўка можа весціся і на дрэвах, адведзеных для высечак і іншага прамежкавага карыстання з ліку дрэў, прызначаных пад высечку. Падсочка праводзіцца на дрэвах ва ўзросце ад 51 года. Западсочыць адну лесасеку, напрыклад, на плошчы 1,7 гектара могуць за два дні два леснікі. Для гэтага адбіраюцца бярозы з дыяметрам ствала не менш за 20 сантыметраў. Бензапілой на дрэве робіцца адзін надрэз пад вуглом 30 градусаў ад вертыкальнай восі, а калі дыяметр ствала большы за 34 сантыметры — два. Даўжыня надрэзу не павінна перавышаць 12 сантыметраў, глыбіня — не большая за чатыры сантыметры, калі дрэвы не ідуць пад высечку. Калі трапляюць у гэтую катэгорыю — можна не прытрымлівацца параметраў.

Лесаводы збіраюць сок штодня па меры напаўнення мяшкоў. З адной бярозы можна атрымаць да 200 літраў, на гэта трэба два-тры тыдні. Што важна, у канцы сезона нарыхтоўкі жалабкі трэба абавязкова зняць і зрэзы замазаць сумессю вапны з глінай. Гэта робіцца для прафілактыкі захворванняў дрэў. Калі трымаецца тэмпература 10—15 градусаў цяпла ўдзень і 3—4 градусы цяпла ўначы на працягу некалькіх тыдняў, можна быць упэўненым: сезон нарыхтоўкі карыснага напою спынены.

Дарэчы, як адзначаюць спецыялісты, самы лепшы сок той, што атрымліваецца з бяроз, якія растуць на чыстых супясчаных глебах і пагорках. Ад карыснага напою, сабранага каля балота, можна чакаць цямнейшага колеру альбо жаўцізны. «У першыя дні падсочвання з дрэў, дзе ёсць шмат наплываў, зліваем першыя літр-паўтара. Тады сок самы чысты. Хоць на смакавыя якасці гэта ніяк не ўплывае», — кажа Алена Варашкевіч.

— Цана бярозавіку ў лясніцтве і гандлёвых пунктах адрозніваецца, — заўважае дырэктар лясгаса Антон Раманоўскі. — На дзялянцы можна набыць літр напою за 23 капейкі, на спецыяльных гандлёвых пляцоўках — за 36 капеек. У крамах кошт будзе вышэйшы. Сёлета хочам рэалізаваць насельніцтву не менш за 30 працэнтаў сабранага аб'ёму соку, нават імкнёмся да 50 працэнтаў. На сёння агульны паказчык рэалізаванай прадукцыі ў лясніцтве складае крыху больш за 36 тон. З пачатку сезона, напрыклад, у Чэрвені ўжо нарыхтавалі 85 тон бярозавіку, у Беразіно — 62, у Старобіне — 39, у Старых Дарогах — 74 тоны. Яны гатовы да збыту.

Фота БелТА.

Большасць спажыўцоў хоча пераканацца ў тым, што ім прадаюць экалагічна чысты прадукт. Таму і прыязджаюць непасрэдна на дзялянку, каб адразу пераліць сок з пакета ў сваю тару. Вось і **жыхарка пасёлка Чырвоная Слабада Галіна ЛАПАЦІНА** наведвае лясны «пункт» з мужам штогод. «Зараз узялі 80 літраў напою. Верым у яго гаючыя ўласцівасці. Даўно даказана, што бярозавы сок вельмі карысны, яго раяць пасля аперацый. Да таго ж ён амаль бясплатны. Заўсёды закатваю каля ста літраў — летась, напрыклад, было 60 слоікаў. У нас вялікая сям'я, таму разыходзіцца хутка».

Каб нарыхтоўваць бярозавы сок самастойна, неабходна звярнуцца ў найбліжэйшае лясніцтва або лясгас. Спецыялісты пакажуць месцы, растлумачаць тэхналогію збору і прасочаць за правільным завяршэннем працэсу. Калі правілы не будуць выкананы, парушальнікаў — фізічных асоб чакае штраф да 20 базавых велічынь, індывідуальных прадпрымальнікаў — да 100, юрыдычных асоб — да 500. Напрыклад, сёлета ў Старобінскім лясгасе з дапамогай фотапасткі злавілі двух такіх парушальнікаў і прыцягнулі да адміністрацыйнай адказнасці.

Нагадаем, што лясгасы краіны ўжо сабралі каля трох тысяч тон бярозавіку, з іх 285 тон прадалі насельніцтву, астатняе — перапрацоўчым прадпрыемствам. Лідарам па нарыхтоўцы сярод абласцей пакуль з'яўляецца Брэсцкая, там сабралі палову карыснага напою, што складае 1647 тон.

Дар'я ШЛАПАКОВА.

Надвор'е

Халодны подых Скандынавіі

Ужо ў ноч на нядзелю падмарозіць да мінус 10 градусаў

Вось ужо сапраўды сакавік — зменлівы месяц нясмелай вясны. То цёпла і ціха, то месцамі парывісты вецер і начныя замаразкі... Калі ў пятніцу пры ўмераным ветры і 6—12 градусах цяпла будзе камфортна, то ўжо ў нядзелю выпадзе снег, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра гідраметэаралогіі, кантролю радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.

У суботу праз тэрыторыю нашай краіны будзе перамяшчацца халодны атмасферны фронт. Месцамі пройдуць невялікія кароткачасовыя ападкі, у асноўным у выглядзе мокрага снегу. Уначы і раніцай на асобных участках дарог магчымая галалёдзіца. У гэты ж дзень, следам за франтальным падзелам, пачне паступаць паветраная маса з паўночных шырот. Тэмпература паветра ўначы складзе ад мінус 4 да плюс 3 градусаў, па поўначы краіны — да 6 градусаў з мінусам. Удзень будзе ад нуля да плюс 7 градусаў, але з-за парывістага паўночнага ветру дзённая тэмпература будзе адчувацца як 1—6 градусаў марозу.

На наступны дзень, у нядзелю, атмасферны ціск яшчэ вырасце. Уладу над надвор'ем у краіне паступова возьме халодны паўночна-атлантычны антыцыклон, які перамяшчаецца з тэрыторыі Швецыі на краіны Балтыі. Тэмпература паветра ўначы будзе ад мінус 2 да мінус 8 градусаў, у паўночных раёнах пры праясненнях — да мінус 10 градусаў. Удзень будзе ад мінус 2 градусаў да 4 градусаў цяпла. У асноўным абыдзецца без ападкаў, толькі месцамі па паўднёвым усходзе краіны чакаецца невялікі кароткачасовы снег. На асобных участках дарог магчымая галалёдзіца. Вецер прагназуецца паўночна-заходні парывісты.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных сіноптыкаў, надвор'е ў нашай краіне застанецца пад уплывам халоднага антыцыклону і ў першай палове наступнага тыдня. Уначы невялікі мароз, месцамі снег, мокры снег. Удзень — слабы плюс.

Сяргей КУРКАЧ.

ФАКТЫ ПАДЗЕІ НАВІНЫ ФАКТЫ ПАДЗЕІ НАВІНЫ

Праверка працягваецца

Ва Узброеных Сілах працягваецца комплексная праверка баявой і мабілізацыйнай гатоўнасці Узброеных Сіл.

Цяпер праходзіць яе другі этап. Падчас яго вайскоўцы 120-й зенітнай ракетнай брыгады здзейснілі марш працягласцю 100 кіламетраў у прызначаны раён. Ён быў неабходны для правядзення баявога зладжвання ў складзе падраздзяленняў і выканання вучэбна-баявых задач. Пра гэта паведамілі ў абаронным ведамстве. Большая частка спецыялістаў калісьці праходзіла службу ў 120-й брыгадзе. Гэта кіроўцы, начальнікі разлікаў, аператары самаходных агнявых установак.

Тым часам праходзяць практычныя заняткі з афіцэрамі сярод сіл тэрытарыяльнай абароны Клецкага раёна. Неўзабаве яны працягнуць заняткі ў складзе ўзводаў, рот і батальёна. Яны будуць ахоўваць і абараняць важныя аб'екты ў рэжыме жыццезабеспячэння і барацьбы з умоўнымі дыверсійна-разведвальнымі групамі.

Валяр'ян ШКЛЕННІК.

Пачынаецца сезон палявання на птушку

З 20 сакавіка адкрываецца сезон палявання на самцоў глушца і цецерука. Іх дазволена здабываць у перыяд з 3 гадзін ночы да 9 гадзін раніцы. Спосаб палявання — ружэйны на таках, з падыходу і з засады.

Як нагадалі ў Дзяржаўнай інспекцыі аховы жывёльнага і раслінага свету пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь, можна выкарыстоўваць наразную паляўнічую зброю з дульнай энергіяй кулі звыш 400 джоўляў, гладкаствольную паляўнічую зброю з патронамі са шротам, паляўнічыя лукі і арбалеты пэўных параметраў. Пералік патронаў, якія забяспечваюць такую дульную энергію, і параметры лукаў і арбалетаў пазначаны ў дадатку 2 да Правіл вядзення паляўнічай гаспадаркі і палявання. У выпадках здабычы самкі глушца або цецерука з паляўнічага будзе спаганяцца плата ў двухразовым памеры ад кошту дазволу на здабычу самца гэтага віду.

З 21 сакавіка (з трэцяй суботы сакавіка) можна будзе паляваць і на самцоў слонкі, здабываць самак у гэты перыяд таксама забаронена. Паляваць дазваляецца ружэйным спосабам з засады на цязе (цяга — токавы палёт слонак). Калі ляціць пара слонак, страляць рэкамендуецца па апошняй птушцы, бо гэта, як правіла, і ёсць самец.

Пры паляванні на слонку можна выкарыстоўваць гладкаствольную паляўнічую зброю з патронамі са шротам. Дазволены час палявання — з 18 да 22 гадзін, у іншы час зброя павінна быць разраджана і зачэхлена. Перасоўванне паляўнічага з зараджанай зброяй дапускаецца толькі ў працэсе палявання пры выбары аптымальнага месца засады з найбольш інтэнсіўнай цягай.

Для вышуку і падачы здабытай дзічыны дазволена выкарыстанне паляўнічых сабак наступных парод: тэр'еры, таксы, выжлы, спаніэлі, рэтрыверы, водныя сабакі.

Закрыецца сезон веснавога палявання на самцоў цецерука, глушца і слонкі, як і на іншых птушак, 10 мая.

Сяргей РАСОЛЬКА.

На конкурсах «Славянскага базару ў Віцебску» Беларусь прадставяць Раман Волазнеў і Ангеліна Ламака

Сталі вядомы імёны прадстаўнікоў нашай краіны на вакальных конкурсах міжнароднага фестывалю мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску — 2020».

У фінале дзіцячага адбору суддзі аддалі першынство Ангеліне Ламака. 13-гадовая спявачка займаецца адразу ў дзвюх музычных школах — у Мінску і Лепелі, сама піша песні, мае за плячыма фіналы нацыянальных адбораў на «Дзіцячае Еўрабачанне» і «Новую хвалю», выступленне ў расійскім тэлепраекце «На ўвесь голас» (2018 год).

Імя Рамана Волазнева, думаецца, таксама няблага знаёма прыхільнікам музычных тэлепраектаў. Ужо ў дзесяць гадоў хлопец трапіў у топ-10 нацыянальнага адбору на дзіцячае «Еўрабачанне» і сыграў у музычным спектаклі «Новыя брэменскія музыканты». Заняў другое месца на «Дзіцячай Новай хвалі — 2009», неаднаразова быў стыпендыятам Спецыяльнага фонду Прэзідэнта Беларусі па падтрымцы таленавітай моладзі. У 2012 годзе атрымаў Гран-пры конкурсу «Маладыя таленты Беларусі», мае ў актыве шэраг прэмій міжнародных музычных і вакальных конкурсаў. Два гады таму Раман, ужо маючы вопыт работы ў ансамблі «Сябры», выпусціў свой дэбютны альбом, а летась небеспаспяхова выступіў у расійскім музычным праекце «Голас».

Нагадаем, 29-ы па ліку фестываль «Славянскі базар у Віцебску» пройдзе з 13 да 21 ліпеня.

Вікторыя ЗАХАРАВА.

Скрала шпіца ў якасці... сябра для сваёй аўчаркі

Аператыўнікі Заводскага РУУС сталіцы затрымалі жанчыну, якая каля крамы паквапілася на сабаку, які чакаў свайго гаспадара.

Паводле аператыўнай інфармацыі, гісторыя разгарнулася на ганку адной з прадуктовых крам. Як паведамляе МУС,19-гадовы хлопец, ідучы ў магазін, прывязаў чатырохногага сябра за ланцужок да парэнчаў. Да пакінутай без нагляду жывёлы падышла жанчына. Пастаяўшы некалькі хвілін каля шпіца, яна зняла з сабакі ланцужок і знесла жывёліну ў невядомым напрамку.

Гаспадар, які выйшаў з крамы, і ўбачыў, што гадаванца няма на месцы, неадкладна звярнуўся ў міліцыю. Правёўшы шэраг аператыўна-вышуковых мерапрыемстваў і вывучыўшы запісы з камер відэаназірання, супрацоўнікі аддзела крымінальнага вышуку Заводскага РУУС Мінска высветлілі асобу выкрадальніцы сабакі. Ёю аказалася 41-гадовая раней не судзімая жыхарка горада.

Жанчына растлумачыла праваахоўнікам, што ў яе дома жыве нямецкая аўчарка, і, каб уласнаму гадаванцу не было сумна, яна прынесла дадому чатырохногага «сябра» з вуліцы.

Скрадзены шпіц быў вернуты законнаму ўладальніку.

Сяргей РАСОЛЬКА.

ДАЕШ «ЗАРНІЦУ»!

У першую суботу лютага ў школах, як вядома, ладзяць так званыя вечары сустрэч, прымаюць выпускнікоў. Нехта з іх жыве непадалёку, нехта, як кажуць, за светам: аднакласнікі гадамі не бачацца, а то і дзесяцігоддзямі...

У нас вось сустрэліся два Міколы. Некалі найбліжэйшыя сябры былі, вадой, здавалася, не разальеш! Але... Адзін Коля, як той казаў, дзе нарадзіўся, там прыгадзіўся, другі — аж на Далёкім Усходзе асеў...

Карацей, сустрэўшыся, ім было аб чым пагаварыць, было што ўспомніць.

Ну вось, напрыклад. Пасля школы атрымалі гэтыя хлопцы павесткі ў ваенкамат, схадзілі туды, разам вярталіся назад. І трэба ж — у гарадскім парку «зачапіліся» за старое дрэва — згледзелі ўверсе дупло.

— А давай там пляшку схаваем, — прапанаваў адзін Мікола.

— Адслужым, вернемся дамоў — падхапіў ідэю другі, — і разам вып'ем!

Для таго каб гэта зрабіць, сябры схадзілі ў краму, купілі гарэлкі, потым Мікола па мянушцы Штэпсель (бо малы, каранасты) залез на плечы прысеўшаму каля дрэва Міколу Тарапуньку (росту ў ім — метры са два). І як толькі той разагнуўся, апусціў бутэльку ў дупло...

— Надзейная схованка, — зазначыў яшчэ, спусціўшыся на зямлю. — Ніхто не знойдзе. Толькі мы...

— І разам, — паставіў умову Тарапунька. — Той, хто вяртаецца першы, чакае другога.

Сябры, што называецца, ударылі па руках.

І вось за плячыма два гады службы. Вярнуўся да бацькоў адзін Мікола, неўзабаве прыехаў другі — пасталелыя, падужэлыя. Сустрэліся і амаль тут жа рушылі ў парк.

Дрэва з дуплом было на месцы, нідзе не дзелася. Тым жа чынам, што і раней, Мікола Штэпсель быў падняты ўгару. Запусціў руку ў дупло, а бутэлькі... няма.

— Ты лепш шукай, — параіў Тарапунька. — Глыбей руку засоўвай.

— Ды марна: у дупле нічога няма...

Словам, для таго каб адзначыць сустрэчу, хлопцам давялося схадзіць у краму. Пляшка (хоць і не тая, без «вытрымкі») у іх з'явілася... Праблема засталася: адзін п'янаваты Мікола не верыў другому, пытаўся:

— Ты праўда ў дупло не лазіў?

— Не! Гадам буду! Я цябе чакаў!

— А дзе тады пляшка?..

Як ні дзіўна, разгадаў гэту «загадку» Міколаў малодшы брат.

— Дык гэта што — ВЫ паклалі тую бутэльку?! — усклікнуў ён, зразумеўшы прычыну сваркі.

Ну і далей расказаў, што іх школьны ваенрук ладзіў гульню «Зарніца», што менавіта ў парку займаўся падрыхтоўкай «разведчыкаў». Для выпрацоўкі практычных навыкаў тым, напрыклад, уручалася па адной карце, у якой пазначалася месца, дзе схавана другая, потым — трэцяя... А ўрэшце абедзве групы павінны былі знайсці апошнюю схованку: хто гэта зробіць першы (адшукае карту «праціўніка»), той і перамог.

— Наша каманда, — расказваў малодшы брат, — «вылічыла» тое дупло: і карту знайшла, і бутэльку.

— Дык дзе яна? — усхапіліся Міколы.

— Ваенрук забраў. Сказаў — на праверку.

...Пачуў я гэту гісторыю і міжволі пацягнуўся ў парк.

Дрэва з дуплом, на жаль, не знайшоў: можа, бура паваліла, можа, камунгас спілаваў — насадзіўшы новых...

Адным словам — было дзе пагуляць.

Продавец: ОАО «Гомельоблстрой», г. Гомель, ул. Малайчука, 12. **Порядок ознакомления с имуществом осуществляется по контактному тел.:** 8 (029) 185-37-18 – управляющий в деле о банкротстве Колеснев Николай Михайлович; 8 (044) 700-40-60 – по спецтехнике и оборудованию Кучинский Владимир Александрович; 8 (044) 769-19-61, 8 (0232) 53-27-62 – по недвижимости Яроцкая Людмила Николаевна. **Шаг аукционных торгов – 5 (пять) % от начальной цены предмета аукциона и не изменяется в течение всего аукциона. Для участия в аукционе необходимо: 1**. Оплатить задаток на расчетный счет **Продавца (ОАО «Гомельоблстрой»)**: р/с BY73 BLBB 3012 0400 0516 9300 1001, в Головной ф-л по Гомельской области ОАО «Белинвестбанк», БИК BLBBBY2X, УНП 400051693, назначение платежа – задаток за участие в аукционных торгах по лоту № (задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления); **2.** Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов можно **с 20 марта 2020 г.** по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, 2-й этаж, каб. «Эксперт-Услуга» в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 16.00. Прием заявлений для участия в аукционе **заканчивается 1 апреля 2020 г. в 16.00 включительно (предварительно по контактным телефонам Организатора торгов).** Заявления, поступившие после установленного срока, не принимаются. Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за **5 (пять) дней** до его проведения.

В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только единственным участником (претендентом на покупку), объекты аукциона продаются этому участнику при его согласии по начальной цене**, увеличенной на 5 (пять) %**. Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается **Продавцом** в течение **5 (пяти) рабочих дней** со дня проведения торгов. Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену. Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: подписать протокол о результатах аукциона; заключить договор купли-продажи в течение **5 (пяти) календарных дней** от даты подписания протокола о результатах аукциона; оплатить приобретаемое имущество согласно договору купли-продажи в течение **10 (десяти) рабочих дней** с момента его подписания и возместить затраты и расходы на организацию и проведение аукциона в течение **5 (пяти) рабочих дней** с момента подписания протокола. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет исполнения обязательств по договору купли-продажи. Проводится аукцион в соответствии с Положением Открытого акционерного общества «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части) и с Законом РБ от 13.07.2012 № 415-3 (ред. от 04.01.2014) «Об экономической несостоятельности (банкротстве)» ст.127-129. **Ранее опубликованное извещение о торгах размещено в газете «Звязда» от 05.11.2019 г. № 211 (29078). Порядок оформления участия в аукционе, в том числе документации, необходимой для регистрации участника торгов, порядок проведения аукциона размещены на официальном сайте Организатора торгов – www.expert-usluga.by раздел «Аукционы» или www.gomeloblreklama.by, www.bankrot.gov.by. Дополнительная информация по контактным телефонам Организатора торгов: 8 (0232) 23-23-54, 23-23-56, 8 (029) 126-66-62.**

«Мілая матуля, я цябе люблю!»



ПА ГАРЫЗАНТАЛІ: 1. Без бацькі — паўсіраты, а без маці і ўся ... *(прык.)*. **5.** «Цеплынёй атуліць // Сонейка зямлю. // Мілая..., // Я цябе люблю!» З верша Л. Пранчака «Мілая ...». **8.** Весялосць лепш за ... *(прык.)*. **9.** Аконны пераплёт. **11.** Руханне на транспарце. **13.** Капельнік, ... Народныя назвы сакавіка месяца. **14.** Твор антычнай скульптуры. **16.** Рэлігійнае аб'яднанне. **17.** «Пастой, чорна ..., // Ты мая, ты мая! // Яна яму шчабятала: // Не твая, не твая!» З беларускай народнай песні «Кацілася чорна галка». **18.** Схіл, спуск. **19.** «Ці я ў мамы не ..., // Ці я не дачушка? // Руса каса да паяса, // Чырвоная стужка». Прыпеўка. **20.** Перамяшчэнне з месца на месца чаго-небудзь. **22.** Прыхільнік скептыцызму. **25.** Тое, што і збан. **27.** Тры рэчы выклікаюць любоў: ..., сціпласць і шчодрасць *(прык.)*. **28.** Высокі сан у хрысціянскай царкве. **29.** Каштоўнае ўпрыгажэнне; найлепшы падарунак жанчыне. **30.** Саманадзейнасць.

ПА ВЕРТЫКАЛІ: 1. Матчына ... ў дзетках *(прык.)*. **2.** Папугай. **3.** Група падвод. **4.** Беларуская багіня, апякунка кахання, вясновых карагодаў і шлюбаў. **5.** Вершаваны памер. **6.** Вечназялёнае хвойнае дрэва. **7.** Якога куста ..., такога яна і смаку *(прык.)*. **10.** «Біла ж мяне... // Канапляным прутам. // Не хадзі ты, дачушачка, // З гэтым баламутам». Прыпеўка. **12.** «З вясной прыходзіць ..., // І абуджэнне ада сну». З верша А. Грушэцкага «Вясна». **15.** ... да вянца, а розум да канца *(прык.)*. **16.** Без маці і ... не грэе *(прык.)*. **19.** Жаночыя слёзы і ранішні ... высыхаюць аднолькава хутка *(прык.)*. **21.** ... ды добрая жонка — на шчаслівага *(прык.)*. **22.** Гнеў маці як ... — выпадзе многа, але растае хутка *(прык.)*. **23.** У каго на розуме малітва ды ..., а ў яго — бабскі хвост *(прык.)*. **24.** Тое, што і стос. **26.** Закаханым заўсёды ... кароткая *(прык.)*. **27.** Тады Юзік ажэніцца, калі лысы ... ацеліцца *(прык.)*.

Лявон ЦЕЛЕШ, *г. Дзяржынск.*

АДКАЗЫ:

Па гарызанталі: 1. Сірата. 5. Матуля. 8. Багацце. 9. Рама. 11. Язда. 13. Зімабор. 14. Антык. 16. Секта. 17. Галка. 18. Нахіл. 19. Дачка. 20. Аднос. 22. Скептык. 25. Жбан. 27. Вера. 28. Епіскап. 29. Жэмчуг. 30. Апломб.

Па вертыкалі: 1. Сэрца. 2. Ара. 3. Абоз. 4. Лада. 5. Метр. 6. Туя. 7. Ягада. 10. Матулечка. 12. Закаханне. 15. Краса. 16. Сонца. 19. Дождж. 21. Скарб. 22. Снег. 23. Пост. 24. Кіпа. 26. Ноч. 27. Вол.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	7.11	19.24	12.13
Віцебск —	7.01	19.14	12.13
Магілёў —	7.01	19.14	12.13
Гомель —	6.58	19.10	12.12
Гродна —	7.27	19.39	12.12
Брэст —	7.27	19.39	12.12

Месяц

Апошняя квадра 16 сакавіка.
Месяц у сузор'і Вадаліва.

Імяніны

Пр. *Марыі, Матроны, Васіля, Емяльяна, Капітона, Мікалая, Паўла, Яўгена, Яфрэма.*
К. *Аляксандры, Клаўдзіі, Святланы, Анатоля, Вінцэнта.*



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ЗАЎТРА



Даты | Падзеі | Людзі

20 САКАВІКА

1897 год — нарадзіўся Мікалай Фёдаравіч Гікала, ваенны і партыйны дзеяч. З 1918-га — на ваеннай і партыйнай рабоце. У студзені 1932-га — студзені 1937-га — першы сакратар ЦК КП(б)Б. У 1938 годзе рэпрэсаваны. Рэабілітаваны пасмяротна.

1927 год — нарадзіўся Хведар Дзмітрыевіч Жычка, беларускі паэт. Быў галоўным рэдактарам газеты «Літаратура і мастацтва». Аўтар паэтычных зборнікаў «Росныя лілеі», «Стой на вахце, сэрца» і іншых. Многія вершы паэта пакладзены на музыку беларускімі кампазітарамі.

1930 год — нарадзіўся Барыс Міронавіч Шапіра, беларускі вучоны-эканаміст, доктар эканамічных навук, прафесар, заслужаны работнік сельскай гаспадаркі Беларусі. Аўтар навуковых прац па праблемах сельскагаспадарчай вытворчасці, рэфармавання аграпрамысловага комплекса Беларусі.

1942 год — падчас Вялікай Айчыннай вайны партызаны пасля 12-гадзіннага бою вызвалілі раённы цэнтр Клічаў і ўключылі яго ў Клічаўскую партызанскую зону.

1972 год — у Мінску адкрыта Генеральнае консульства Польшчы.

1800 год — італьянскі навуковец Алесандра Вольта ў лісце прэзідэнту Лонданскага каралеўскага таварыства паведаміў аб сваім вынаходстве батарэі электрычных элементаў (вольтаў слуп) — першай крыніцы пастаяннага току, якая адкрыла новую эру ў даследаванні электрычнасці.

1880 год — нарадзіўся Рыгор Барысавіч Бархін, расійскі архітэктар, горадабудаўнік, педагог, заслужаны дзеяч навукі і тэхнікі. Адзін з заснавальнікаў Саюза савецкіх архітэктараў.

1915 год — нарадзіўся Святаслаў Тэафілавіч Рыхтэр, расійскі піяніст, народны артыст СССР (1961), Герой Сацыялістычнай Працы (1975). Адзін з найбуйнейшых музыкантаў-выканаўцаў XX стагоддзя.

1945 год — ажыццёўлены першы палёт «самалёта-снарада» 10-Х распрацоўкі калектыву канструктарскага бюро на чале з Уладзімірам Чаламеем.

УСМІХНЕМСЯ

Наведвальнік:
— А вось ведаеце, як было раней: хлеб у соль макнеш, часначком акраец натрэш... смаката!
Афіцыянт:
— Ну дык вы ўжо ўсё выбралі, якога года Шаблі падаць да вашага тузіна нармандскіх вустрыц?

Інтэлект сучаснай моладзі ўжо напалову штучны.

— Добры дзень, а ў вас ёсць кнігі па матывацыі?
— Так, вунь там на далёкай паліцы.
— А бліжэй няма?

На сумоўі.
— Скажыце, якія лідарскія якасці ў вас ёсць?
— На любой гулянцы пасля тосту я заўсёды першы перакульваю чарку.



ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Рэгістрацыйнае пасведчанне нумар 2 ад 17 лютага 2009 года, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, бухгалтэрыі — 287 18 81.

прыём рэкламы тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by (для зваротаў): zvarot@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 14.804. Індэкс 63850. Зак. № 950.

Нумар падпісаны ў 19.30 19 сакавіка 2020 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА

20 сакавіка 2020 г. № 11 (547)

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

ТЭМА ТЫДНЯ

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

КОЖНАЕ ДРЭЎЦА МАЕ СВАЁ МЕСЦА

Што і дзе можна саджаць, каб упрыгожыць сталічныя вуліцы і двары

Больш за два мільёны кветак, звыш 13 тысяч дрэў і каля 46 тысяч кустоў высадзяць сёлета на сталічных вуліцах. Навінкай 2020-га стане з'яўленне на раздзяляльных лініях уздоўж дарог жывой агароджы з кустоў. Акрамя таго, у кожным адміністрацыйным раёне Мінска арганізуюць клумбу, прысвечаную 75-годдзю Перамогі. Якія расліны парадуюць беларусаў і гасцей Мінска ў гэтым сезоне і чым можа дапамагчы азеляняльнікам кожны з нас, карэспандэнт запыталася ў спецыялістаў. стар. 13

БЛІЗКАЯ ЎЛАДА

25 ПЫТАННЯЎ ЗА ТРЫ ГАДЗІНЫ

Менавіта столькі было званкоў, якія паспела прыняць падчас прамой тэлефоннай лініі старшыня Савета Рэспублікі Наталля КАЧАНАВА

Праўду кажучы, калі лічыць па колькасці, пытанняў атрымаецца значна больш: многія з заяўнікаў агучвалі па дзве-тры, а то і больш праблемных тэм запар, карыстаючыся магчымасцю быць пачутымі на высокім узроўні. Тэлефон працаваў у рэжыме нон-стоп, ні на секунду не сціхаючы: людзі агучвалі як свае жыццёвыя праблемы, крыўду на нейкую сітуацыю, так і цікавыя прапановы і ініцыятывы. Але пра ўсё падрабязней. стар. 2

СЁННЯ Ў НУМАРЫ

Аператыўна і эфектыўна

Разгляд зваротаў у крыху іншым фармаце апрабавалі ў Савеце Рэспублікі. стар. 3

Крона горада

У Гродне перасаджваюць нават дарослыя дрэвы — дыяметрам да 18 сантыметраў. стар. 14

Цікавы вопыт

У Чэрвеньскім раёне Міншчыны жыхары актыўна ўдзельнічаюць у азеляненні. стар. 14

Плюс 21 суботнік

Як у Папінскім сельсавеце, што на Брэстчыне, падтрымліваюць парадак агульнымі намаганнямі. стар. 15

Імянныя лаўкі

Цікавы праект па добраўпарадкаванні рэалізуецца ў Брэсце. стар. 16

Грамадзянскую пазіцыю варта падтрымліваць

Старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні Міхаіл РУСЫ правёў прамую тэлефонную лінію.

Людзі звярталіся з рознымі пытаннямі і просьбамі. Асабіста для сябе Міхаіл Русы вылучыў званок з Віцебска, так бы мовіць, на медыцынска-гуманітарную тэму. Жанчына, якая прадставілася Марыяй Рыгораўнай, прапанавала ўнесці папраўкі ў дакументы, што датычацца маці, у якіх малыя дзеці знаходзяцца ў бальніцах. Згодна з сённяшнімі правіламі, маці можа пастаянна прысутнічаць у бальніцы з дзіцем да пяці гадоў — пасля ўжо нельга. Таму яна просіць павялічыць максімальны ўзрост маленькіх пацыентаў да сямі гадоў. Гэтае пытанне будзе вывучана, і жанчына атрымае адказ.

Яшчэ Марыя Рыгораўна падзялілася адным назіраннем: у суседняй бальнічнай палаце ляжыць трохгадовая дзяўчынка з дзіцячага дома, і яе ніхто не наведвае — зусім адна. Жанчына палічыла гэта несправядлівым і папрасіла свайго суразмоўцу нейкім чынам пасадзейнічаць таму, каб маленькі чалавек адчуў клопат і ўвагу да сябе, што, безумоўна, паспрыяе выздараўленню.

Такое стаўленне да незнаёмага дзіцяці, што трапіла ў складаную жыццёвую сітуацыю, Міхаіл Іванавіч назваў праяўленнем грамадзянскай пазіцыі, якую варта падтрымліваць. Ён патэлефанаваў у абласны Савет дэпутатаў і парэкамендаваў знайсці магчымасць паклапаціцца аб дзяўчынцы.

У дзень правядзення прамой тэлефоннай лініі надвор'е ў краіне рэзка пагоршылася, раніцай і ўдзень сямтам пачаліся завіруха і моцны снегапад, якія ўскладнілі рух транспарту на дарогах. І вось званок з Лепельскага раёна: чаму мясцовыя службы марудзяць з ачысткай дарог ад снегу? Чаго чакаюць? Пытанне было вырашана аператыўна: старшыня Пастаяннай камісіі звязаўся па тэлефоне з кіраўніцтвам Мінтранса і папрасіў паскорыць барацьбу са снежнымі заносамі ў Лепельскім раёне.

Трэба адзначыць, што ў грамадзян нашай краіны інтарэс да дзейнасці Пастаяннай камісіі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні даволі высокі. Прыблізна 200 зваротаў паступіла ў камісію з пачатку года. Праўда, шмат узнімаецца пытанняў, якія можна было б вырашыць на мясцовым узроўні без умяшання рэспубліканскіх органаў улады. Па-ранейшаму застаюцца актуальнымі тэмы, звязаныя з зямлёй. Вострыя спрэчкі з мясцовай уладай па зямельных пытаннях, на жаль, фіксуюцца ў многіх раёнах. Часта ў гэтым вінаватыя і самі землекарыстальнікі — здараецца, просяць у заяве соткі на вядзенне асабістай прысядзібнай гаспадаркі, а па факце будуюць дом і лазню.

Нярэдка зямельныя канфлікты з'яўляюцца вынікам памылак і няправільных дзеянняў раённых і сельскіх Саветаў, безадказных паводзін асобных прадстаўнікоў мясцовых службаў, што без вывучэння канкрэтнай сітуацыі, без выезду на месца прымаюць рашэнні, ад якіх узнікаюць непаразуменні і, як вынік, звароты ў Савет Рэспублікі.

Міхаіл Русы адзначыў, што прамыя тэлефонныя лініі і прыёмы грамадзян дазваляюць убачыць, напрыклад, як на практыцы выкарыстоўваецца зямельнае заканадаўства і якія карэкціроўкі ў ім ужо наспелі. Усе канструктыўныя прапановы і ідэі ўлічваюцца і аналізуюцца.

Леанід ТУГАРЫН.

25 ПЫТАННЯЎ ЗА ТРЫ ГАДЗІНЫ

Фота БелТА.

Больш інфармацыі

Анатоль Дзмітрыевіч з вёскі Прылессе Мінскага раёна расказаў пра невялікую грунтовую дарогу, што вядзе да гаражнага кааператыва: маўляў, куды ні звярталіся — грошай на яе ўладкаванне ў найбліжэйшы час не прадугледжана. Людзі гэта разумеюць, просяць хоць абмежаваць хуткасць руху ў гэтым месцы, каб аўто, што лётаюць (не іначай) па ёй, не надта пылілі мясцовым жыхарам.

Спікер верхняй палаты даручыла кампетэнтным спецыялістам разабрацца ў праблеме.

Другой агучанай тэмай стала прапанова ў гонар 75-й гадавіны Вялікай Перамогі трансляваць у тэлевізійным эфіры кадры ваеннай кінахронікі: дакументальныя стужкі заўсёды лепш адлюстроўваюць тагачасную рэчаіснасць, чым тысячы слоў і мастацкіх твораў, лічыць Анатоль Дзмітрыевіч.

Наталля Качанава пагадзілася з гэтым меркаваннем, адзначыўшы, што прапанова слушная, заслугоўвае ўвагі і рэалізацыі:

— Я сёння ж зраблю ўсё магчымае, каб выправіць гэту сітуацыю, — падкрэсліла яна.

Наталля Самохіна з Мінска лічыць, што на дадзены момант прымаецца недастаткова мер па прафілактыцы распаўсюджвання каранавіруса, ды і наогул інфармацыі ў СМІ пра сітуацыю з яго прафілактыкай магло б быць больш.

> Цяпер ідзе трэці Год малой радзімы: наша агульная задача — максімальна высаджваць дрэвы, кусты, кветкі. Прыемна, што людзі гэта разумеюць і актыўна бяруць удзел у добрай справе. Я ўдзячна мінчанам, якія адгукнуліся на такую прапанову, і ў надыходзячы сезон, мяркую, мы актыўна далучымся да гэтай работы.

Спікер верхняй палаты парламента падкрэсліла, што ў дзяржаве прымаюцца ўсе адэкватныя меры, каб захаваць здароўе людзей, надзвычайнай сітуацыі няма: «У нашай краіне галоўнае — гэта людзі». Так, узмоцнены санітарна-каранцінны кантроль у пунктах пропуску, Нацыянальным аэрапорце Мінск. Становішча знаходзіцца на няспынным кантролі спецыялістаў, якія нясуць за гэта адказнасць.

Беларусь не абмяжоўвала рух людзей і тавараў, выконваючы рэкамендацыі Сусветнай арганізацыі аховы здароўя. САЗ лічыць, што такія меры падчас надзвычайных сітуацый у галіне аховы здароўя ў большасці выпадкаў не з'яўляюцца эфектыўнай мерай. «Зачыніўшы граніцы, мы праблему не вырашым», — растлумачыла Наталля Качанава. У той жа час, калі інфармацыі людзям недастаткова, трэба ўзмацніць інфармацыйную работу ў гэтым кірунку, упэўнена спікер Савета

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)

Адзінокая 75-гадовая мінчанка Таіса Канстанцінаўна расказала, што вентыляцыйная шахта не функцыянуе, бо сусед заблакаваў яе пасля рамонту. Справа не аднаго дня, ёсць нават судовае рашэнне аб неабходнасці вяртання кватэры ў праектнае становішча, аднак яно не выконваецца. Жанчына вінаваціць ва ўсім жыллёва-эксплуатацыйную арганізацыю, якая не прымае дастатковых мер.

— Тут вы маеце рацыю: калі ёсць рашэнне суда — яно павінна выконвацца. Паглядзім і разбяромся, — запэўніла Наталля Качанава.

Мінчанка Галіна Яршова ўзняла пытанне неабходнасці капрамонту дома па вуліцы Чайкоўскага, які быў пабудаваны яшчэ ў 1956 годзе. Калісьці людзям казалі, што дом падлягае зносу, але цяпер гарадскія ўлады ад гэтых планаў адмовіліся. Жанчына сцвярджае, што рамонт ні разу тут не выконваўся.

Аб неабходнасці капрамонту ў доме расказаў старшыні Савета Рэспублікі — яшчэ адзін мінчанін Андрэй Пірагоў, што жыве на Партызанскім праспекце. Па ўсіх гэтых фактах дадзены адпаведныя даручэнні, па выніках разгляду заяўнікаў праінфармуюць.

Рэспублікі. Адпаведнае даручэнне яна накіруе адказным асобам.

Камунальныя стасункі

Асобнай тэмай любой прамой лініі з'яўляецца работа жыллёва-камунальнай гаспадаркі. Пра яе недахопы расказала мінчанка Таццяна Васілеўна, што жыве на вуліцы Разінскай: жанчына паскардзілася на смурод, што атачае дом. Наталля Качанава звязалася з намеснікам старшыні Мінгарвыканкама Аляксандрам Дараховічам, даручыла неадкладна выехаць на месца і праінфармаваць аб прынятых мерах.

Больш кветак і дрэў

Дарэчы, апошні заяўнік з гэтага спіса ўзняў не толькі тэму адлічэнняў на капрамонт і мэтазгоднасці іх размеркавання — неабыякавы жыхар сталіцы агучыў праблему высечкі дрэў. У якасці прыкладу ён паведаміў пра знішчэнне ў Заводскім раёне ў 2018 годзе парку пад будучую забудову і пацікавіўся стаўленнем да гэтай тэмы Наталлі Качанавай.

— Гэта і маё меркаванне, і даручэнне Прэзідэнта краіны: максімальна захоўваць зялёныя насаджэнні. А што і дзеля чаго высеклі — я разбяруся, — запэўніла спікер верхняй палаты парламента, якая з'яўляецца ўпаўнаважанай кіраўніка дзяржавы па Мінску. — Мінгарвыканкаму будзе пастаўлена задача максімальна выключыць высечку дрэў у сталіцы.

Яна адзначыла, што даручана высаджваць больш дрэў, кустоў і кветак, і ўдзел грамадзян у гэтай справе толькі вітаецца.

— Людзі хвалююцца аб тым, каб захаваць зялёныя насаджэнні, не высякаць дрэвы. Але такая задача стаіць перад усімі: арганізацыямі, якія займаюцца гэтым пытаннем, грамадзянамі нашай краіны, — падкрэсліла Наталля Качанава, каментуючы «МС» гэты зварот (дарэчы, тэма тыдня сённяшняга выпуску датычыцца зялёных насадак у сталіцы і рэгіёнах. **— Рэд.**). — Цяпер ідзе трэці Год малой радзімы: наша агульная задача — максімальна высаджваць дрэвы, кусты, кветкі. Прыемна, што людзі гэта разумеюць і актыўна бяруць удзел у добрай справе. Я ўдзячна мінчанам, якія адгукнуліся на такую прапанову, і ў надыходзячы сезон, мяркую, мы актыўна далучымся да гэтай работы.

Жыллё і жыццё

Не абмінулі заяўнікі і тэму жыллёвага будаўніцтва. Жыхарка Мінскага раёна, маці двух малых, прасіла пасадзейнічаць у атрыманні льготнага крэдыту на рэканструкцыю прыватнага дома. Таксама маладая маці з Іўя паскардзілася, што ў райцэнтры будуецца жыллё толькі для шматдзетных, але чаго чакаць тым, у каго двое дзяцей? Мужчына з Віцебшчыны агучыў свае хваляванні: ён стаіць на ўліку грамадзян, якія маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў у Лёзне, але сам жыве з сям'ёй у Полацку, і яго не ставяць там на чаргу. Усе гэтыя пытанні патрабуюць дадатковага вывучэння, таму кампетэнтныя службы зоймуцца высвятленнем усіх абставін, аб чым праінфармуюць Савет Рэспублікі.

> Зачыніўшы граніцы, мы праблему каранавіруса не вырашым», — растлумачыла Наталля Качанава. У той жа час, калі інфармацыі людзям недастаткова, трэба ўзмацніць інфармацыйную работу ў гэтым кірунку.

Гучалі таксама пытанні, якія закраналі тэмы судовых рашэнняў, разгляду зваротаў грамадзян адказнымі асобамі і стаўлення іх да заяўнікаў, падліку працоўнага стажу, неабходнага для пенсійнага забеспячэння, складанасцяў працаўладкавання ў невялікім населеным пункце і іншыя.

Дарэчы, пра асаблівасці працоўных стасункаў расказаў малады цясляр з Гродна, які працуе на буйным будаўнічым прадпрыемстве. Хлопец паведаміў пра зніжэнне заробкаў, перапрацоўкі і атрыманне вымовы за тое, што ў рабочы час пайшоў на прыём да ўрача. Разгляд гэтага звароту ўзяты на асабісты кантроль спікерам верхняй палаты парламента.

Падводзячы вынікі прамой лініі, Наталля Качанава паведаміла журналістам, што падобная форма плённая: людзі могуць агучыць свае праблемы без неабходнасці звяртацца на асабісты прыём.

— Мне прыемна, што людзі агучваюць прапановы па развіцці свайго горада, раёна, кажуць пра тое месца, дзе яны жывуць, — падкрэсліла яна. — Людзі бесперапынна тэлефанавалі на працягу трох гадзін, каб агучыць, што іх хвалюе. А гэта розныя пытанні, якія датычацца ўсіх сфер жыццядзейнасці.

У рабоце са зваротамі недапушчальны фармалізм, ніводная просьба не павінна заставацца без адказу, рэзюмавала яна.

Вольга АНУФРЫЕВА.

АПЕРАТЫЎНА І ЭФЕКТЫЎНА

Разгляд зваротаў грамадзян у крыху іншым фармаце, чым гэта было раней, апрабавалі ў Савеце Рэспублікі

Старшыня Пастаяннай камісіі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці Віктар ЛІСКОВІЧ правёў у аўторак, 17 сакавіка, асабісты прыём грамадзян. Да сенатара прыйшлі тры чалавекі, якія агучылі розныя пытанні: ад стасункаў з шумнымі суседзямі да стаўлення мясцовых улад да вырашэння праблем шматдзетнай сям'і.

ВОЧЫ Ў ВОЧЫ

Новае, як вядома, гэта добра забытае старое. Таму назваць цяперашнюю гутарку з заяўнікамі нейкім новым фарматам правядзення прыёмаў грамадзян будзе не зусім правільна, бо такая форма работы добра вядомая. Гаворка ідзе аб запрашэнні да разгляду тэм, якія ўздымаюцца, кіраўнікоў і прадстаўнікоў профільных міністэрстваў, ведамстваў, тэрытарыяльных органаў улады, у чыёй кампетэнцыі знаходзіцца разгляд праблемнага пытання. Канешне, яны ў далейшым задзейнічаны ў ланцужку пры падрыхтоўцы пісьмовага адказу заяўніку, але ж фармат «вочы ў вочы» — больш эфектыўны, лічыць сенатар. І вось чаму.

Папярэдні вопыт работы ў кіраўніцтве рэгіянальнай вертыкалі ўлады даказаў, што 70—80 % зваротаў вырашалася ўжо на этапе падрыхтоўкі іх да разгляду ў адведзены дзень: падключаліся кампетэнтныя спецыялісты, і адказ заяўніку быў больш грунтоўны, вывучаны і матываваны. Чытай — больш эфектыўны, бо ўтрымліваў канкрэтныя парады, рашэнні і высновы.

> У Савет Рэспублікі людзі прыязджаюць з усіх рэгіёнаў краіны з пытаннямі па рознай тэматыцы. Акрамя такой формы работы, сенатары выкарыстоўваюць прамыя тэлефонныя лініі і практыкуюць выязныя прыёмы грамадзян у рэгіёнах.

— Гэта дазваляе хутчэй вывучыць пытанне і ўжо, па сутнасці, разам з грамадзянінам разабрацца ў той ці іншай жыццёвай сітуацыі, — кажа старшыня камісіі і падкрэслівае, што такая работа давала вынік: — Калі дасканала разабрацца ў сітуацыі, якая склалася, грамадзянін атрымае адказ на сваё пытанне. І нават калі ён будзе адмоўны, чалавек павінен пераканацца ў тым, што на гэты момант штосьці зрабіць у яго сітуацыі немагчыма.

НЕПРЫЕМНАЕ СУСЕДСТВА І ПАМЕР ПЕНСІІ

Такую практыку Віктар Лісковіч вырашыў працягваць і ў Савеце Рэспублікі: да сённяшняга прыёму грамадзян далучыліся **кіраўнік адміністрацыі Цэнтральнага раёна Мінска Дзмітрый Пятруша і начальнік упраўлення пенсійнага забеспячэння Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Алена ДРОНАВА.**

Першы заяўнік — біёлаг і распрацоўшчык лекавых прэпаратаў з Мінска — скардзіўся на шум з суседняй кватэры, маўляў, там займаюцца нейкай вытворчай дзейнасцю і днём, і ноччу — немагчыма нармальна адпачыць. Як высветлілася, гісторыя цягнецца не першы год — з моманту пабудовы дома ў 2013 годзе. Але шматлікія праверкі не пацвердзілі наяўнасці там вытворчасці.

Як растлумачыў кіраўнік адміністрацыі Цэнтральнага раёна сталіцы Дзмітрый Пятруша, заява разглядалася ў 2015 годзе. Вынік той жа — звычайная кватэра, у якой першапачаткова жылі будаўнікі, што рабілі ў ёй рамонт. З таго часу зваротаў не было, але перад сённяшнім разглядам супрацоўнікі адміністрацыі зазірнулі на «шумны» адрас — звычайная кватэра без прыкмет вытворчай дзейнасці. Таксама кіраўнік растлумачыў алгарытм дзеянняў, які існуе ў сталіцы.

— Механізм рэгламентуюць Правілы карыстання жылымі памяшканнямі, згодна з артыкулам 21.16 якіх (а ён датычыцца іх парушэнняў) на шумных суседзяў могуць паўплываць як ЖЭСы, так і РАУСы. Практыка рэагавання з боку адміністрацыі наступная: пасля выкліку міліцыі і складання рапарта на гэты конт інфармуецца адміністрацыя раёна, а далей у дачыненні да парушальніка спакою надыходзіць адміністрацыйная адказнасць, — кажа Дзмітрый Пятруша.

І каб былі падставы прыцягваць да адказнасці суседа, трэба перш-наперш зафіксаваць гэты факт.

Другога заяўніка, які прыехаў з Салігорска, хваляваў памер яго пенсіі, які, з яго пункту гледжання, быў заніжаны. Мужчына ўжо неаднойчы звяртаўся ў розныя інстанцыі, адказ адзін: усё законна. Да сенатара ён прыйшоў з прапановай ставіцца індывідуальна ў выключных выпадках, да якіх ён адносіць і свой.

Як растлумачыла начальнік упраўлення пенсійнага забеспячэння Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Алена Дронава, у дачыненні да пажылога чалавека выкарыстаны па максімуме ўсе магчымыя параметры пры налічэнні яму пенсіі: працоўны стаж, работа ў асабліва небяспечных умовах працы, індывідуальны каэфіцыент заробку — у выніку мужчына штомесяц атрымлівае 1075 рублёў. Трэба ўлічваць, што сярэдні памер пенсіі сёння складае 446 рублёў, звярнула яна ўвагу.

> “Мы адсочваем тэндэнцыі. І калі нейкае пытанне мае сістэмны характар, будзем уносіць ініцыятывы па змене таго ці іншага артыкула закона, які рэгулюе адпаведную сферу дзейнасці.

— Прымаць індывідуальныя рашэнні ў дачыненні да вас не дазваляе заканадаўства, — адзначыў Віктар Лісковіч. У той жа час ён паабяцаў улічыць агучаныя заяўнікам заўвагі.

НА АСАБІСТЫ КАНТРОЛЬ

Сваю няпростую жыццёвую сітуацыю паведаміла жыхарка Бабруйска, маці пяці дзяцей: старэйшай дачцэ 16 гадоў, малодшай — толькі тры месяцы. Праблемы фактычна вынікаюць адна з адной: муж некалькі гадоў таму страціў нагу, мае трэцюю рабочую групу інваліднасці, але, зразумела, з-за фізічнай асаблівасці працаваць можа не ўсюды. На мясцовым прадпрыемстве, дзе працуюць інваліды, яго заробак не дасягае і 300 рублёў. Да таго ж ён з'яўляецца абавязанай асобай па Дэкрэце № 18 і з яго ўтрымліваюць большую частку заробку — у кошт пагашэння запазычанасці, якая ўжо складае каля пяці тысяч рублёў. На пытанне, з чаго сям'я жыве, жанчына адказала, што так і жыве: за «дзіцячыя», аліменты ад першага сужэнца, і сама імкнецца падзарабіць, дзе можа. Яна прасіла дапамагчы з працаўладкаваннем мужа на іншую больш прыбытковую работу, а таксама пасадзейнічаць з медыцынскім абследаваннем і вырабам камфортнага пратэза, ды і наогул заклікала мясцовую ўладу больш уважліва ставіцца да праблем шматдзетных сем'яў.

> Папярэдні вопыт работы ў кіраўніцтве рэгіянальнай вертыкалі ўлады даказаў, што 70—80 % зваротаў вырашаліся ўжо на этапе падрыхтоўкі іх да разгляду ў адведзены дзень: падключаліся кампетэнтныя спецыялісты, і адказ заяўніку быў больш грунтоўны, вывучаны і матываваны.

Са свайго боку, старшыня профільнай камісіі паабяцаў падтрымку ў вырашэнні жыццёвых праблем бабруйчанкі, адпаведна, даў даручэнне міністэрствам адукацыі і аховы здароўя, а таксама Магілёўскаму аблвыканкаму разабрацца з агучанымі жанчынай пытаннямі па сваіх кірунках, узяўшы на асабісты кантроль гэты зварот.

Падагульняючы разгляд зваротаў грамадзян, Віктар Лісковіч звярнуў увагу, што ў Савет Рэспублікі людзі прыязджаюць з усіх рэгіёнаў краіны з пытаннямі па рознай тэматыцы. Акрамя такой формы работы, сенатары выкарыстоўваюць прамыя тэлефонныя лініі і практыкуюць выязныя прыёмы грамадзян у рэгіёнах. Напрыклад, на наступным тыдні старшыня Пастаяннай камісіі плануе наведаць Зэльвенскі раён Гродзеншчыны, дзе правядзе прыём грамадзян.

Уся інфармацыя па зваротах абагульняецца і дэталёва аналізуецца. «Мы адсочваем тэндэнцыі. І калі нейкае пытанне мае сістэмны характар, будзем уносіць ініцыятывы па змене таго ці іншага артыкула закона, які рэгулюе адпаведную сферу дзейнасці», — падсумаваў сенатар.

Вольга АНУФРЫЕВА, фота аўтара.

ЭКАНОМІКА

АСНОВА БЮДЖЭТУ

Стан прамысловасці — гэта важны паказчык для мясцовай улады. Як спрацуюць прадпрыемствы — паспяхова ці са стратамі, — ад гэтага залежыць многае. У прыватнасці, стабільнасць і аб'ёмы напаўнення бюджэту, сітуацыя на рынку працы, узровень яе аплаты. І, адпаведна, — гэта фундамент пры стварэнні ўмоў для годнага жыцця выбаршчыкаў.

Старшыня Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў Уладзімір ЦЯРЭНЦЬЕЎ падчас выязных мерапрыемстваў у глыбінцы заклікае калег актыўна дапамагаць не толькі дзяржаўным прадпрыемствам, але і прадпрымальніцкім структурам. Дарэчы, сярод народных выбраннікаў усё больш бізнесменаў рознага ўзроўню. Іх вопыт, амбіцыі ў плане развіцця прадпрыемства, жаданне спрыяць падрыхтоўцы кадраў — гарантыя паспяховай будучыні. І нямала прыкладаў, калі падчас трыяды Года малой радзімы ў глыбінцы адкрываюць прадпрыемствы, крамы, філіялы вытворчасцяў.

Між іншым, на Віцебшчыне больш за 100 тысяч чалавек працуе на прыкладна 1100 суб'ектах прамысловага сектара эканомікі. А ў агульным аб'ёме выручкі 67 % — унёсак менавіта прамысловасці.

Пытанні развіцця і задачы гэтага комплексу эканомікі часта абмяркоўваюцца на сесіях Саветаў раённага і абласнога ўзроўню, органаў выканаўчай улады. А нядаўна — на пасяджэнні Віцебскага аблвыканкама. Сярод удзельнікаў былі і кіраўнікі-дэпутаты.

Губернатар Мікалай ШАРСНЁЎ канстатаваў рэчы, якімі можна ганарыцца. Напрыклад, рэнтабельнасць продажаў летась дасягнула 4,3 % (пазалетась была 3,1 %). Чысты прыбытак на прадпрыемствах павялічыўся прыблізна ў два разы — да 505 мільёнаў рублёў. Стратных прадпрыемстваў стала 34 (у 2018 годзе — 44).

Першы намеснік старшыні Віцебскага аблвыканкама Алег МАЦКЕВІЧ пералічыў «пытанні з барадой», недахопы, якія перашкаджаюць актыўнаму развіццю. У прыватнасці, літаральна ў ручным рэжыме, бывае, даводзіцца дапамагаць інвестару ў выдзяленні зямельных участкаў. Часцяком няпроста падключыць аб'ект будучай вытворчасці да электрасетак і іншых камунікацый, як і выканаць патрабаванні ўсіх будаўнічых нормаў і правіл. Ёсць, скажам так, складанасці пры мытным афармленні... Гэтыя і іншыя нюансы, як падкрэсліў першы віцэ-губернатар, здзіўляюць інвестараў і адбіваюць ахвоту нешта рабіць, рэалізоўваць інвестыцыйны праект.

Што датычыцца даўно працуючых прадпрыемстваў, дык, на жаль, на іх у большасці няма магчымасцяў для абнаўлення абсталявання, бо ў дэфіцыце ўласныя абаротныя сродкі.

Намеснік міністра эканомікі Рэспублікі Беларусь Юрый ЧАБАТАР акцэнтаваў увагу на неабходнасці актыўней засвойваць гандлёвыя рынкі дальняй дугі для збыту прадукцыі. Вельмі важна памятаць, што яна павінна быць канкурэнтаздольная. Гэта магчыма пры інвестыцыях у развіццё вытворчасці.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

БЛІЗКАЯ ЎЛАДА

Эфектыўны інструмент дэмакратыі

Старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве Сяргей СІВЕЦ правёў асабісты прыём грамадзян.

Прыём у значнай ступені аказаўся тэматычны. Каторы раз звароты ў асноўным былі па зямельным пытанні, якое ўжо нагнала аскомы. Людзі прыйшлі са скаргамі на неправамерныя, на іх погляд, дзеянні органаў мясцовай улады, выканкамаў пасялковых і сельскіх Саветаў, райвыканкамаў і раённых службаў, на фармалізм і абыякавасць іх супрацоўнікаў пры вырашэнні надзённых і зусім нескладаных пытанняў і праблем выкарыстання зямельных участкаў. Прасілі дапамагчы, бо ісці ўжо больш няма куды.

Напрыклад, мінчанін Мікалай Мікалаевіч пасля выхаду на пенсію набыў домік у вёсцы Уздзенскага раёна. Разгарнуў там бурную гаспадарчую дзейнасць: ён і пчалавод, і садавод, і агароднік. Усё нібыта нічога, але зямельныя спрэчкі і непаразуменні атручваюць жыццё. І, што асабліва крыўдна пенсіянеру, мясцовыя ўлады замест падтрымкі ставяцца да яго праблем насцярожана. Праўду Мікалай Мікалаевіч шукае ў судах. Пакуль не знайшоў, але запэўніў Сяргея Сіўца: падрыхтаваў некалькі судовых іскаў і не супакоіцца, пакуль не вырашыць пытанне.

Дзве жанчыны сталага ўзросту прыехалі на прыём са Слуцкага раёна. Жыццёвыя гісторыі ў іх нібыта розныя, але па сутнасці яны зводзяцца да аднаго: дапамажыце ў спрэчках і канфліктах па зямельных пытаннях, бо мясцовыя чыноўнікі робяць выгляд, што слухаюць, а на самай справе не ўнікаюць у сутнасць іх лістоў і скаргаў. Таму і прыехалі на прыём.

Старшыня Пастаяннай камісіі пракаментаваў вынікі прыёму карэспандэнту «МС». Па яго словах, просьбы і пажаданні, якія ўтрымліваюцца ў сённяшніх зваротах, будуць вырашаны ў прававым полі ў межах кампетэнцыі Савета Рэспублікі.

Мы спыталі, на якія ўвогуле думкі яго як юрыста з вялікім досведам наводзяць прыёмы грамадзян і прамыя тэлефонныя лініі, аналіз сёлетніх зваротаў у Пастаянную камісію Савета Рэспублікі.

Сяргей Сівец адзначыў, што ўсе формы работы з грамадзянамі: прамыя тэлефонныя лініі, асабістыя прыёмы, пісьмовыя і электронныя звароты людзей у верхнюю палату парламента — гэта эфектыўны інструмент непасрэднай дэмакратыі, вынік рэалізацыі артыкулаў 37 і 40 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь. Гэтыя артыкулы — нормы прамога дзеяння. Людзі праз свае звароты ў Савет Рэспублікі, праз канкрэтныя прапановы па ўдасканаленні дзеючага заканадаўства, нават няхай і праз скаргі, рэалізуюць сваё права ўдзельнічаць у кіраванні дзяржавай.

— Задавальняе тое, што ў нашым дзеючым заканадаўстве няма крытычных прабелаў, істотных недахопаў. У прынцыпе яно сучаснае, апрабавана на практыцы і з'яўляецца комплексным і сістэмным рэгулятарам, — кажа Сяргей Сівец. На яго погляд, асноўныя праблемы ўзнікаюць на ўзроўні прававымянення. І тут не апошнюю ролю адыгрывае чалавечы фактар: фармальны падыход да вырашэння канкрэтнай праблемы асобнага грамадзяніна, нядобрасумленнае выкананне службовых абавязкаў. І пакуль мы не пазбавімся чэрствасці ў адносінах да людзей, падобныя скаргі ў рэспубліканскія органы ўлады будуць працягвацца, хоць пераважную долю такіх зваротаў трэба вырашаць на месцах. Прычым гэта можна рабіць без асаблівых намаганняў у межах паўнамоцтваў органаў мясцовай улады, упэўнены парламентарый.

Леанід ЛАХМАНЕНКА.

КАБ УКЛАСЦІСЯ Ў ТЭРМІН

Пытанні, якія ўзнікаюць падчас рэалізацыі інвестыцыйных праектаў, трэба вырашаць неадкладна

Старшыня Савета Рэспублікі, кіраўнік назіральнага савета ААТ «Нафтан» Наталля КАЧАНАВА правяла пасяджэнне назіральнага савета гэтага акцыянернага таварыства, на якім былі разгледжаны вынікі работы прадпрыемства за мінулы год, а таксама рэалізацыя інвестпраектаў.

Асаблівая ўвага на пасяджэнні была звернута на пытанні будаўніцтва ўстаноўкі запаволенага каксавання, паведамілі ў прэс-службе верхняй палаты беларускага парламента.

Спікер Савета Рэспублікі запатрабавала паскорыць работы па гэтым праекце, каб завяршыць яго ў вызначаны кіраўніком дзяржавы тэрмін.

— Неабходна завяршыць будаўніча-мантажныя работы ў маі і выходзіць на зададзеныя параметры ў верасні бягучага года. Заказчыку і падрадчыку трэба сур'ёзна працаваць, павялічваць колькасць працуючых на будаўнічых пляцоўках, аператыўна вырашаць пытанне дааснашчэння абсталяваннем, каб усё выканаць у тэрмін. Канешне, задача няпростая, таму што падчас рэалізацыі інвестыцыйных праектаў заўсёды з'яўляюцца пытанні, якія трэба вырашаць неадкладна, — адзначыла яна.

Трэба сказаць, што мадэрнізацыя прадпрыемства дасць магчымасць павялічыць глыбіню перапрацоўкі нафтавай сыравіны з 72 % да 90 %, выхад светлых нафтапрадуктаў з 53—55 % да 65 %, а таксама атрымаць новы прадукт — нафтавы кокс. Яго выкарыстоўваюць у якасці паліва ў цэментнай прамысловасці, а таксама ў энергетыцы. Акрамя таго, у сумесі з нізкасярністым коксам гэты прадукт знойдзе прымяненне ў металургіі.

ПАРЛАМЕНЦКАЯ ДЫПЛАМАТЫЯ

Інтарэсы выбаршчыкаў — і за мяжой таксама

У дзеючым скліканні Палаты прадстаўнікоў рабочыя групы па супрацоўніцтве з парламентамі замежных дзяржаў упершыню фарміраваліся па рэгіянальным прынцыпе. Гэта сведчыць пра рост значнасці парламенцкай дыпламатыі. Дэпутаты на міжнародных пляцоўках і ў кантактах з замежнымі калегамі будуць не толькі абараняць і прасоўваць інтарэсы беларускай дзяржавы ў цэлым, але і згадваць пра свае акругі, выбаршчыкаў і садзейнічаць наладжванню бізнес-стасункаў паміж імі і рэгіёнамі за мяжой.

Фота БелТА.

Эфектыўнасць рэгіянальнага супрацоўніцтва асабліва відавочная паміж Расіяй і Беларуссю. Мясцовыя ўлады менш схільныя да палітызацыі, лепш ведаюць патрэбы вытворцаў, інтарэсы бізнесу. Пакуль эліты краіны занятыя глабальнымі праблемамі, канкрэтныя прадпрыемствы і арганізацыі заключаюць кантракты і вырашаюць пытанні збыту, паставак, сумеснай вытворчасці і выхаду на рынкі. Таму ў свой час рэгіянальныя беларуска-расійскія форумы сталі выконваць важную ролю ў эканамічным узаемадзеянні дзвюх краін. Цяпер падобны эфект чакаецца ад беларуска-ўкраінскіх і беларуска-ўзбекістанскіх форумаў рэгіёнаў. І зусім невыпадкова менавіта парламент — галоўны арганізатар сустрэч такога фармату.

«Парламентарыі павінны садзейнічаць міжрэгіянальнаму супрацоўніцтву і развіццю рэгіёнаў, забеспячэнню росту заробкаў і павышэнню якасці жыцця грамадзян», — адзначыў **старшыня Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА** на семінары, прысвечаным прыярытэтам міжнароднага парламенцкага супрацоўніцтва, які нядаўна прайшоў у ніжняй палаце Нацыянальнага сходу Беларусі.

Усяго ў Палаце прадстаўнікоў сфарміраваны 72 рабочыя групы па супрацоўніцтве з парламентамі замежных дзяржаў, міжпарламенцкая камісія па супрацоўніцтве Нацыянальнага сходу Беларусі і Нацыянальнага Сходу Арменіі, а таксама 12 дэлегацый у міжнародных парламенцкіх арганізацыях. Акрамя таго, у Савеце Рэспублікі сфарміраваны міжпарламенцкія камісіі па супрацоўніцтве з верхнімі палатамі парламентаў Казахстана, Расіі і Францыі.

Спікер ніжняй палаты адзначыў, што развіццё сучаснай сусветнай палітыкі ва ўмовах глабалізацыі і фарміравання шматпалярнага свету прад'яўляе новыя патрабаванні да выбудоўвання міжнародных парламенцкіх адносін.

«Парламенцкая дыпламатыя становіцца ўсё больш запатрабаваным, канцэптуальна важным і перспектыўным фарматам узаемадзеяння, здольным умацаваць давер паміж краінамі, — сказаў Уладзімір Андрэйчанка. — Беручы ўдзел у шматбаковых міжнародных форумах, накіроўваючыся з візітамі ў замежныя дзяржавы, парламентарыі могуць эфектыўна дапоўніць намаганні дыпламатаў у вырашэнні вострых міжнародных і рэгіянальных праблем, стрымліванні росту крыніц пагроз і нестабільнасці».

Па яго словах, адным з пацвярджэнняў росту ўсеагульнай увагі да міжпарламенцкага супрацоўніцтва з'яўляецца распрацоўка Дэкларацыі Міжпарламенцкага саюза аб парламенцкай дыпламатыі, падрыхтоўка праекта якой плануецца сёлета на 142-й Асамблеі МПС.

Пры гэтым парламенту Беларусі, па словах старшыні Палаты прадстаўнікоў, адводзіцца асаблівая роля ў развіцці і ўмацаванні міжнароднага аўтарытэту краіны, абароне і прасоўванні яе нацыянальных інтарэсаў на сусветнай арэне.

У гэтай сувязі Уладзімір Андрэйчанка абазначыў перад калегамі шэраг задач: у зносінах з парламентарыямі іншых краін весці работу, накіраваную на непалітызаваную ацэнку падзей у Беларусі; дзеля ўмацавання міжрэгіянальнай стабільнасці шукаць і развіваць новыя формы ўзаемадзеяння на міжнародных парламенцкіх пляцоўках.

> Парламентарыі павінны садзейнічаць міжрэгіянальнаму супрацоўніцтву і развіццю рэгіёнаў, забеспячэнню росту заробкаў і павышэнню якасці жыцця грамадзян.

«Важна, каб голас Мінска гучаў і быў чутны ў розных кутках свету, у розных міжнародных парламенцкіх структурах, якіх на сённяшні дзень налічваецца ўжо больш за 70, — акцэнтаваў увагу спікер. — Гэта наш імідж, рэпутацыя, палітычная вага».

Кіраўнік ніжняй палаты заклікаў дэпутатаў актывізаваць намаганні для прасоўвання ініцыятыў Прэзідэнта Беларусі аб запуску новага перагаворнага працэсу «Хельсінкі-2» і фарміраванні «Пояса лічбавага добрасуседства».

Не менш важны складнік парламенцкай дыпламатыі — садзейнічанне поўнамаштабнаму гандлёва-эканамічнаму супрацоўніцтву, дыверсіфікацыі паставак беларускай прадукцыі на знешнія рынкі.

Уладзімір Андрэйчанка падкрэсліў мэтазгоднасць актыўнага прыцягнення парламентарыяў да работы міжурадавых камісій па гандлёва-эканамічным супрацоўніцтве. Ён выказаў упэўненасць, што вопыт, веды і прафесіяналізм беларускіх парламентарыяў дазволяць годна працаваць па ўсіх кірунках міжнароднай парламенцкай дзейнасці, і спадзяецца, што парламенцкае супрацоўніцтва «зможа забяспечыць максімальны эфект для паскарэння сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны».

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.

Тэлесеткі

ФАКТАР ТАЛЕНТУ

Перадкастынг беларускай версіі аднаго з самых папулярных у свеце талент-шоу «X-Factor» прайшоў у мінулыя выхадныя ў Гродне. Перад прадзюсарскай групай праекта ў чатырох конкурсных намінацыях выступіла амаль 200 выканаўцаў, як прафесіяналаў, так і аматараў і нават тых, хто ніколі раней не выступаў перад публікай. А ў чарзе ахвотных на парадак больш — папярэдне зарэгістравалася каля 2500 чалавек!

Ужо ў гэтую суботу і нядзелю адборы працягнуцца ў Магілёве — з 12 да 20 гадзін усіх ахвотных чакаюць у малой зале Палаца культуры (Пушкінскі праспект, 7). «Улічвайце, што спяваць трэба а капэла, таму адказна падыходзьце да рэпертуару. Неабходна выбраць такія песні, якія максімальна раскрыюць ваш вакальны талент, пакажуць вас з найлепшага боку», — раіць кандыдатам **выканаўчы прадзюсар беларускага «X-Factor» Вольга ШЛЯГЕР.** Таксама давядзецца адкласці ўбок музычныя інструменты і максімальна сканцэнтравацца — у кожнага артыста ёсць усяго некалькі хвілін, каб зрабіць уражанне на журы.

Самыя яркія нумары трапяць на тэлекастынгі — іх запішуць улетку, а ўдзельнікаў збяруць у трэніровачным лагеры для далейшай работы. Шоу стартуе ў эфіры ў верасні. Пераможцу ж, нагадаем, вызначаць гледачы напрыканцы года.

Вікторыя ЦЕЛЯШУК.

На хвалі

«МАЛАДЫЯ ТАЛЕНТЫ БЕЛАРУСІ» ЗАСПЯВАЮЦЬ ПРА ВЯЛІКУЮ ПЕРАМОГУ

Першы канал Беларускага радыё аб'явіў аб старце прыёму заявак для ўдзелу ў IX Рэспубліканскім творчым радыёконкурсе «Маладыя таленты Беларусі». Сёлета ён прысвечаны 75-годдзю Вялікай Перамогі.

Калі пад вокнамі гарадскіх шматпавярховікаў буяе кветкавая прыгажосць, гэта заўжды радуе вока. Рознакаляровы духмяны россып — заслуга жыхароў, бо камунальнікі не займаюцца пасадкай кветак у дварах. Як правіла, варта пачаць аднаму — і падцягваюцца іншыя, яшчэ і негалоснае спаборніцтва ладзяць, у каго лепш ды ярчэй атрымаецца. Тым больш што, разбіваючы клумбу, не трэба ўзгадняць з уладамі, якія кветкі там будуць расці.

— Мы заўжды вітаем ініцыятыву жыхароў, калі яна разумная, прыгожая, эстэтычная, бо ў сталічных дварах усё ж павінен быць адпаведны ўзровень. Аднак, добраўпарадкоўваючы тэрыторыю двара, трэба памятаць: тое, што падабаецца аднаму, можа быць не да густу іншаму, — параіла прадстаўніца МГЖГ. — Калі чалавек мае намер зрабіць нейкую канструкцыю накшталт аркі над сцежкай ці зялёнай сценкі, трэба ўзгадніць гэта з эксплуатуючай арганізацыяй, якая зацікаўлена ў тым, каб выконваліся інтарэсы ўсіх жыхароў. Хтосьці хоча ў двары альтанку, а некаму яна будзе перашкаджаць, бо там могуць збірацца шумныя кампаніі.

Кветкавае ўпрыгожванне вітаецца, а вось выкарыстанне на клумбах шын і фігурак з іх — не. У тым ліку і ў якасці агароджы вакол кветніка або каб прадухіліць заезд аўто на газон.

— Цяпер шын у дварах амаль няма. Там, дзе яны былі, мы тлумачылі жыхарам, што гэта небяспечна. Тое ж датычыцца і ўпрыгожвання клумб і палісаднікаў пластыкавымі бутэлькамі. Часам людзі перабіраюць з гэтым меру. Адна справа нейкія каралі з крышачак зрабіць, на агароджу павесіць, і іншая — калі бутэлькі паўсюль на клумбе, што зямлі не відаць, — канстатавала Настасся Вараб'ёва.

Газонныя шкоднікі

Разам з жыхарамі і ДАІ камунальнікі змагаюцца і з аматарамі паркоўкі на зялёнай зоне. Усё часцей паабапал дарог у дварах з'яўляюцца слупкі і паўсферы, якія перашкаджаюць заехаць коламі на газон. Часам уздоўж праездаў высаджваюць жывую агароджу.

Аднак не толькі машыны псуюць траву. «Народныя» сцежкі, пратаптаныя людзьмі там, дзе ім зручней хадзіць, шарэюць сярод газонаў пастаянна. Вырашыць гэтую праблему цалкам, магчыма, не ўдасца ніколі, аднак сёлета робяцца пэўныя захады.

— Мінгарвыканкам разглядае пытанне аб правядзенні на тэрыторыі кожнага раёна сталіцы абследавання такіх незапланаваных сцежак, каб ацаніць мэтазгоднасць стварэння там пешаходных сувязяў і выдзялення на гэта фінансавання. Аднак зрабіць гэта ўсюды, дзе пратапталі сцежку, вядома, немагчыма. Па-першае, на гэтым месцы могуць праходзіць падземныя камунікацыі, а па-другое, стварэнне сцежкі з пліткамі — гэта добраўпарадкаванне, якое патрабуе праектна-каштарыснай дакументацыі і сур'ёзнай работы, — растлумачыла спецыяліст.

Клумбы і алеі да 75-годдзя Перамогі

З 23 акцый, запланаваных сёлета ў сталіцы да вясенняга месячніка па добраўпарадкаванні, сем прысвечаны святкаванню 75-годдзя Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне.

Летась увосень на кветніках горада высадзілі больш за 300 тысяч цыбульных раслін, якія, як мяркуецца, заквітнеюць да 9 Мая, што стане адным з падарункаў гараджанам да свята. А яшчэ ў Мінску пасадзяць 222 дрэвы ў гонар Перамогі, падзялілася **Алена АКУЛІЧ, начальнік аддзела ўтрымання і добраўпарадкавання аб'ектаў зялёнай гаспадаркі Мінскзелянбуду:**

— Напрыклад, у Ленінскім раёне сталіцы на праспекце Ракасоўскага заложаць алею Перамогі са 100 дрэў. У Партызанскім раёне на зялёнай тэрыторыі ў раёне вуліцы Грыцаўца пасадзяць 16 дрэў. 30 новых дрэў у межах акцыі «Дрэвы Перамогі» паселяцца ў Першамайскім раёне.

Сёлета ў Мінску павялічыцца колькасць мнагалетніх кветак, якія дададуць да прыгожа квітнеючых кустоў і складуць дэкаратыўныя кампазіцыі.

— Летась кожны з раёнаў сталіцы пачаў ствараць дзесяць пляцовак, дзе плануецца пасадзіць звыш 15 тысяч кустоў, да якіх будуць дадаваць шматлетнікі. Сёлета гэтая работа працягнецца, і за год высадзяць яшчэ 60 тысяч кветак. А да 75-годдзя Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне ў кожным адміністрацыйным раёне Мінска зробяць спецыяльныя юбілейныя кветкавыя кампазіцыі, — удакладніла спецыяліст Мінскзелянбуду. — Гэта будуць і лічбы «75», і сцягі, і іншыя формы кветкавага афармлення. У асноўным з дывановых раслін, каб стварыць суцэльнае покрыва.

Мінск упрыгожыцца таксама больш чым 16 тысячамі кашпо з ампельнымі кветкамі.

Ірына СІДАРОК.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)

У ТЭМУ

Сёлета ў Мінску выканаюць бягучы рамонт аб'ектаў добраўпарадкавання ў 580 дварах і капітальна адрамантуюць 12 прыдамавых тэрыторый. Адбудуцца капрамонт удасканаленых пакрыццяў, замена дзіцячага і спартыўнага абсталявання, азеляненне двароў.

Бягучага рамонту чакаюць 150 тысяч «квадратаў» асфальту ў дварах, 25 тысяч квадратных метраў плітачнага пакрыцця на сцежках, 211 лесвіц. Адрамантуюць 303 кантэйнерныя пляцоўкі і 12 пляцовак для выгулу жывёл.

Падчас месячніка па добраўпарадкаванні плануецца адрамантаваць пешаходныя сувязі, аднавіць каля 14 гектараў газонаў, адрамантаваць і пафарбаваць больш за 10 тысяч адзінак дзіцячага абсталявання і звыш 18 тысяч малых архітэктурных формаў. Ужо ў сакавіку камунальнікі пачалі наводзіць паслязімовы парадак у падвалах, месцах агульнага карыстання і дварах.

ДОБРАЎПАРАДКАВАННЕ

САМАЕ ДАРАГОЕ ДРЭВА — ЯКОЕ ПАСАДЗІЎ САМ

У Чэрвеньскім раёне жыхары актыўна ўдзельнічаюць у азеляненні

Сёлета ў Чэрвені пройдзе абласны фестываль працаўнікоў сяла «Дажынкі». А калі гаспадар чакае гасцей у дом, то да іх прыёму карпатліва рыхтуецца. Актыўна ідзе падрыхтоўка да свята і ў раёне. Мяняюцца дахі на жылых і адміністрацыйных будынках, ладкуюцца тратуары і асфальтуюцца дарогі.
У райцэнтры з'явяцца новы будынак краязнаўчага музея, дзіцячы садок на 230 месцаў. Да Дня Перамогі прымеркавана адкрыццё загса.

— Акрамя добраўпарадкавання, навядзення парадку на зямлі шмат увагі ўдзяляем азеляненню тэрыторый, — кажа **старшыня раённага Савета дэпутатаў Мікалай ЛОЙКА.** — Сёлета з бюджэту выдзелена 39 тысяч рублёў на кампенсацыйныя пасадкі дрэў. У гэтай справе трохі памяняліся прыярытэты. Калі раней рабілі стаўку на невялікія саджанцы, то цяпер плануем высаджваць падрослыя дрэвы. Як паказала практыка, яны лепш прыжываюцца: нават у тым выпадку, калі зазелянела крона, з'явілася лісце, іх можна перасаджваць. Набываем саджанцы ў арганізацыях, якія займаюцца іх вырошчваннем прафесійна — у Батанічным садзе, пітомніках.

Пасадку дрэў на Чэрвеньшчыне імкнуцца прымеркаваць да значных дат у гісторыі краіны. Таму працэс азелянення ў раёне ідзе бесперапынна.

Летась тут зазелянелі 1200 маладых дрэўцаў. Гэта без уліку кустоў і тых дрэў, што былі пасаджаны арганізацыямі і ўстановамі на суботніках, падчас акцый. А колькі кветак закрасавала на клумбах, каля школ, адміністрацыйных будынкаў, прадпрыемстваў, арганізацый — не злічыць!

— У прыватнасці, сумесна з журналістамі ў гонар 75-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў разбілі парк каля мемарыяла загінулым у Вялікай Айчыннай вайне. Тут з'явілася 40 вечназялёных туй, — працягвае Мікалай Канстанцінавіч. — У межах правядзення 31-га міжнароднага кангрэса Асацыяцыі ўдзельнікаў касмічных палётаў, які праходзіў у Мінску, на радзіму завітаў касманаўт Алег Навіцкі. Ды не адзін. З ім прыехалі трое замежных калег — Міхаіл Карніенка, Кевін Крэгель і Андрэй Барысенка, а таксама дырэктар УП «Геаінфармацыйных сістэм НАН Беларусі» Сяргей Залатой. Яны залажылі Алею касманаўтаў з клёнаў і ясеняў. Раней тут месціўся аварыйны будынак вячэрняй школы, мы яго знеслі, а ўчастак не выстаўлялі на аўкцыён, а падрыхтавалі пад пасадку дрэў, добраўпарадкавалі, устанавілі лаўкі. Пасадзілі тут 31 тую і нашы дэпутаты — менавіта столькі іх абрана ў раённы Савет. Адказная за алею — Таццяна Аляшкевіч, дэпутат райсавета, дырэктар сярэдняй школы № 2, дзе вучыўся Алег Навіцкі. Таццяна Міхайлаўна разам са сваімі вучнямі карпатліва даглядае пасадкі, дапамагаюць ёй і калегі-дэпутаты.

У Маладзёжным парку актывісты БРСМ і валанцёрскага атрада «Жыві сэрцам» высадзілі больш за дваццаць ліп, клёнаў, яблынь, груш. Тут усе ахвотныя могуць таксама саджаць персанальныя дрэўцы з таблічкай у гонар знамянальнай для іх падзеі — уступленне ў шлюб, нараджэнне дзіцяці. У далейшым яны даглядаюць, паліваюць саджанцы, назіраюць, як тыя растуць, набіраюць моц. У будучым сюды будуць прыходзіць іх дзеці, унукі іх дзяцей.

Больш за 1318 пладовых дрэў з'явілася і каля Чэрвеньскага псіханеўралагічнага дыспансера дзякуючы дырэктару сацыяльнай установы Уладзіміру Семіжону і польскім дыпламатам. Адаптаваныя да мясцовых кліматычных умоў саджанцы набытыя ў беларускім інстытуце пладаводства.

— Акрамя таго, 1200 дрэў было высаджана абапал аўтамабільных дарог, — кажа Мікалай Лойка. — Прыжыліся прыблізна каля 75 %, гэта сярэдні паказчык як у вобласці, так і ў краіне. У цэлым у раёне выкананыя стандарты па азеляненні. Замест спілаваных старых дрэў з'яўляюцца новыя. І іх у разы больш, чым зрэзаных.

— І ўсё ж, Мікалай Канстанцінавіч, мабыць, многія гэтага не заўважаюць, выказваюць незадаволенасць?

— Мы тлумачым людзям, што ні адно дрэва не ссякаецца беспадстаўна. Адпаведнае рашэнне прымае райвыканкам на аснове заключэння спецыялістаў, якія праводзяць абследаванні. Напрыклад, ліквідавалі некалькі старых дрэў каля банка, школы, бо яны з цягам часу разрасліся, зацямнялі вокны. Не сакрэт, што раней дрэвы высаджваліся бессістэмна. Дзе пасадзіў — там і расце: на газаправодзе, пад лініямі электраперадачы. Гэта стварала пагрозу для людзей, іх маёмасці. Прывучаем грамадзян і да таго, каб, перш чым пасадзіць дрэвы самастойна, яны звярталіся да спецыялістаў, якія выедуць на месца і праверацъ, ці няма на гэтым месцы інжынерных камунікацый. Можна звярнуцца і да старшыні сельвыканкама, які, калі патрэбна кансультацыя прафесіяналаў, выкліча іх.

— А якія праблемы з новымі пасадкамі?

— Асаблівых праблем няма. Але здараецца, што несвядомыя жыхары іх ломяць.Таму да азелянення імкнёмся прыцягнуць як мага больш людзей, дзяцей. Калі чалавек сваімі рукамі пасадзіў дрэва, то будзе берагчы не толькі яго, але і іншыя, — лічыць Мікалай Лойка.

У раёне прыняты план па добраўпарадкаванні, дзе прадугледжаны раздзел па азеляненні населеных пунктаў, паркаў, скверaў. За кожнай арганізацыяй, прадпрыемствам, школай, што знаходзяцца на тэрыторыі горада і сельсаветаў, замацаваны канкрэтныя ўчасткі. У кожным сельвыканкаме таксама распрацаваны план мерапрыемстваў. Словам, стандарты па азеляненні выконваюцца.

Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.

ПАМЯЦЬ

НА МОГІЛКАХ ПАВІНЕН БЫЦЬ ПАРАДАК

Бо гэта не толькі частка важнага вясновага добраўпарадкавання, але і наша стаўленне да тых, каго з намі сёння няма. Падчас сваёй паездкі па Магілёўскім раёне член Савета Рэспублікі, прарэктар МДУ імя А. Куляшова Алег ДЗЯЧЭНКА звярнуў увагу на тое, у якім стане знаходзяцца сёння грамадзянскія і воінскія пахаванні.

— Для мяне вельмі важна ведаць, чым дыхае раён, якія ёсць магчымасці і ўмовы для яго развіцця, якія існуюць праблемы, — кажа парламентарый. — Могілкі — гэта якраз адно з балючых месцаў, тое, што патрабуе ад нас больш пільнай увагі. Пытанне добраўпарадкавання гэтых месцаў знаходзіцца на асабістым кантролі старшынь сельсаветаў. На жаль, насельніцтва не вельмі ахвотна далучаецца да гэтай адказнасці. Хоць на грамадзянскіх могілках, як вядома, чужых, не знаёмых вяскоўцам людзей не хавалі. Іншая рэч, што вёскі вымірaюць, а могілкі застаюцца. І наш доўг — не пакідаць гэтыя месцы смутку без нагляду.

— Асаблівай увагі патрабуюць менавіта воінскія пахаванні, — адзначае Алег Віктаравіч. — Звесткі аб месцах пахаванняў удзельнікаў партызанскага руху, ваеннаслужачых Чырвонай Арміі, якія загінулі і пахаваны на тэрыторыі Магілёўскага раёна, часта недакладныя. Напрыклад, ураджэнец Магілёўскага раёна, лейтэнант 113-га партызанскага палка Цімафей Медзякоў, які трагічна загінуў у кастрычніку 1943 года, паводле афіцыйных звестак пахаваны ў... трох месцах: брацкай магіле ў вёсцы Майшчына Семукацкага сельсавета, брацкай магіле ў вёсцы Каліноўка Цяхцінскага сельсавета Бялыніцкага раёна і ў адзіночнай магіле на грамадзянскіх могілках у вёсцы Барок Лебядзянкаўскага сельсавета Бялыніцкага раёна. Апошняе пахаванне, дарэчы, і з'яўляецца рэальным. Наша задача — максімальна ліквідаваць гэтыя недакладнасці і ўвекавечыць памяць герояў Вялікай Айчыннай вайны. Гэта адзін з прыярытэтных кірункаў нашай грамадска-палітычнай дзейнасці.

Нэлі ЗІГУЛЯ.

ЦІКАВЫ ВОПЫТ

Кроны для горада

Гэтай вясной у Гродне плануюць стварыць новыя алеі, скверы і паркі. Будуць устаноўлены новыя ландшафтныя інсталяцыі. У азеляненні горада задзейнічана і адмысловая машына, якая перасаджвае дарослыя дрэвы дыяметрам да 18 сантыметраў.

Горад прырастае новымі мікрараёнамі, і гэту тэрыторыю трэба азеляняць. На прадпрыемстве «Гродназелянбуд» распрацаваны план па пасадцы дрэў, кустоў і нават кветак. Паколькі надвор'е стаіць па-сапраўднаму вясновае і зямля не прамерзла, работы пачаліся раней і ўжо ідуць поўным ходам.

Падлічана, што падчас вясновага сезону ў абласным цэнтры пасадзяць 1600 дрэў і 2500 кустоў. Частка раслін высаджана: алеі з маладых ліп, клёнаў і бяроз з'явіліся ў новых мікрараёнах горада. Значныя аб'ёмы работ запланаваны і ў цэнтральнай частцы Гродна. Свабодныя ўчасткі будуць азеляняцца пародамі, прыдатнымі для ўмоў вялікага горада, маладымі дрэўцамі абсадзяць пешаходныя зоны.

У цэнтральных парках дызайнеры прадпрыемства прапануюць свае праекты. Адзін з іх — мабільныя зялёныя сценкі, якія могуць служыць эмблемамі для свят і фестываляў. У новым скверы разам з традыцыйнымі пародамі высадзяць экзатычныя расліны.

Спрыяльнае надвор'е дазволіла яшчэ ў лютым азеляніць мікрараён Альшанка. Гэтую тэрыторыю хутка забудавалі шматпавярховікамі, а вось зялёных зон там амаль не было. Таму менавіта тут пачаліся першыя работы па азеляненні, высаджаны алеі з 225 дрэў. Працягваюцца работы на ўчастках паблізу школ.

Маладая алея ўпрыгожыць пешаходную зону каля новага жылога комплексу, што вырас на месцы былога ваеннага гарадка. Праўда, раней тут былі высаджаны дрэвы метадам кампенсацыйнай пасадкі, але многія не прыжыліся з прычыны засушлівага надвор'я. Тым не менш такія пасадкі будуць працягвацца. Як расказаў **галоўны інжынер прадпрыемства «Гродназелянбуд» Аляксандр РУСАК,** сёлета каля 80 «дарослых» бяроз высаджана такім спосабам каля буйнога гандлёва-забаўляльнага цэнтра, што нядаўна адкрыўся ў Занёманскай частцы горада.

Кампенсацыйныя пасадкі сталі магчымы пасля таго, як у Гродне сем гадоў таму набылі спецыяльную тэхніку — даволі дарагую машыну BIG Jonh 62 DL. «Вялікі Джон» дазваляе перасаджваць ужо дарослыя дрэвы дыяметрам ствала да 18 сантыметраў, не траўміруючы іх. Дрэвы садзяцца на глыбіню звыш метра. Праўда, пакуль «Вялікі Джон» знаходзіцца на рамонце. Як паведаміў Аляксандр Русак, у машыны выйшаў са строю рухавік, і спатрэбіцца некалькі тыдняў, каб яго перабраць. Работа для гэтай тэхнікі ўжо вызначана. Перасадку плануецца ажыццявіць каля будучага анкалагічнага цэнтра, які цяпер у стадыі будаўніцтва. Згодна з праектам, каля 40 дрэў будзе перанесена ад новай стаянкі. У будучым на тэрыторыі анкацэнтра будзе створана зялёная зона.

grodnonews.

Дарэчы, у Гродне пачалі практыкаваць такі від азелянення, як дрэвы ў кадках. Летась некалькі дзясяткаў такіх мабільных клёнаў упрыгожылі гістарычную частку горада. Гэта дрэвы, у якіх каранёвая сістэма развіваецца не так хутка. Усе яны растуць у прыгожых кантэйнерах з гербам горада.

Маргарыта УШКЕВІЧ.

ВЕСНАВЫЯ КЛОПАТЫ

ПЛЮС 21 СУБОТНІК

Як у Папінскім сельсавеце, што на Брэстчыне, падтрымліваюць парадак агульнымі намаганнямі

Ва ўсіх 11 населеных пунктах Папінскага сельсавета Драгічынскага раёна вясна пачалася з навядзення парадку. Не зусім нават вясна — першы суботнік правялі 24 лютага. І ў пачатку сакавіка ўжо таксама тры разы збіраліся талакой на ўборку тэрыторый. А летась старшыня сельвыканкама Святлана ДЫШКО арганізавала 21 суботнік. «Гэта «фішка» новага кіраўніка мясцовай улады — узнімаць грамаду на барацьбу з зарастаннем, засмечваннем, запусценнем», — сказаў пра яе старшыня Драгічынскага раённага Савета Леанід КАРПОВІЧ.

Старшыня сельскага Савета Святлана ДЫШКО *(справа)* і гаспадыня прыватнай сядзібы Святлана ЯРМОЦЫК.

ДРЭВЫ І АГАРОДЖЫ

— Калі прыбіралі могілкі, па 200 чалавек збіралася, — расказвае Святлана Іванаўна. — У нас восем могілак, і толькі адны з іх — у Новай Папіне — значацца на балансе камунальнікаў. Ды і тыя мы прыбіралі агульнымі намаганнямі. Галоўнай праблемай былі дрэвы — высачэзныя сосны, якія патрабавалася знесці. Старасты збіралі грошы, потым заключалі дагаворы з бярозаўскімі спецыялістамі. Альпіністы зразалі дрэвы, а мы на суботніках прыбіралі рэшткі, ачышчалі ад кустоўя, вывозілі смецце на палігоны.

Цяпер могілкі выглядаюць дагледжанымі. Няма кустоў, якія ўздымаліся дзе-нідзе ў рост чалавека. Работа працягваецца, падтрымліваць у парадку такія аб'екты атрымліваецца, калі праяўляць пастаянны клопат. Вось і ў мінулую нядзелю прайшоў сход у вёсцы Кублік, на якім выраша-лі, як патраціць грошы, сабраныя грамадзянамі на замену агароджы. Стараста Васіль Мартынюк паведаміў: сума склала 1800 рублёў. Людзі параіліся і прыйшлі да высновы, што найлепш паставіць шчыкетнік з металапрофілю. Далей вызначыліся, хто будзе купляць матэрыял, як яго транспартаваць, дзе складваць, абазначылі парадак устаноўкі. Гэтак жа вырашаюцца пытанні па кожных могілках.

Ёсць яшчэ адна праблема з добраўпарадкаваннем могілак — і не толькі ў Папінскім сельсавеце, і не толькі ў Драгічынскім раёне. Гэта тоны штучных кветак, якімі кожную вясну завальваюцца адпаведныя пляцоўкі, а потым палігоны бытавых адходаў. Не раз казалі, пісалі, якія шкодныя кампаненты выкарыстоўваюць вытворцы для афарбоўкі, па сутнасці, смецця, якім мы рэгулярна завальваем зямлю. Потым гэтая атрута трапляе ў глебу, у грунтовыя воды з усімі адпаведнымі наступствамі... Дык вось у вёсцы Ляхавічы вырашылі змагацца з навалай агульнымі намаганнямі. Тамтэйшы святар айцец Сергій аб'явіў, што не будзе асвячаць магілы, упрыгожаныя штучнымі кветкамі. Яно і правільна: клопат пра экалогію выглядае вельмі нават богаўгоднай справай. Некаторыя грамадзяне, нязгодныя з такой пастаноўкай пытання, пайшлі ў сельвыканкам шукаць падтрымкі ў мясцовай улады. Але там адказалі, што экалагічную ініцыятыву царквы вітаюць, будуць усяляк падтрымліваць і рэкамендаваць суседзям, каб пераймалі вопыт. Сапраўды, чаму б не завесці «моду» ўпрыгожваць магілы жывымі кветкамі? Цяпер вялікае іх мноства прадаюць у гаршках. Так кветкі прастаяць даўжэй, чым, напрыклад, зрэзаныя, і не ператворацца праз год у атруту для зямлі.

ПРЫБРАЦЬ РАЗАМ

Цікава, што жыхары вёсак разам выходзяць не толькі на суботнікі па паляпшэнні могілак — яны збіраюцца і наводзяць парадак у ваколіцах. Так было ў Кубліку, у Вялікім Лесе, Папіне, ды і іншых. Землі тут у многіх месцах меліяраваныя, іх перасякаюць каналы. А ў тыя за зіму вецер наносіць шмат рознага пластыкавага смецця — вось і даводзіцца яго прыбіраць разам. Часта для гэтай работы прыцягваюць школьнікаў, але і пенсіянеры не адстаюць. «Крыўдна, што людзі не цэняць намаганняў сваіх жа аднавяскоўцаў па ўтрыманні тэрыторый у парадку, — разважае старшыня сельскага Савета. — Атрымліваецца, што дзеці, унукі тых, хто выходзіць на суботнікі, выкідваюць па ўзбочынах бутэлькі, пакеты, іншыя адходы, калі прыязджаюць наведваць родных. Ды і некаторыя вяскоўцы гэтым грашаць. Не прыязджаюць жа да нас з-за мора ці акіяна з пакетамі смецця». Ужо сёлета жыхары прыбіралі вялікі ўчастак уздоўж каналаў у вёсцы Зарэчка. Той участак, дарэчы, прымыкае да пляца, на якім размешчаны не зусім звычайны для нашых мясцін помнік ахвярам вайны.

Падобныя помнікі спрэс узводзілі ў 60-я гады. Спачатку жыхары Зарэчкі і навакольных вёсак насыпалі курган і ўжо потым усталявалі аграмадны абеліск. Яго штогод падфарбоўваюць, падтрымліваюць у парадку навакольную тэрыторыю. Траву заўсёды своечасова падкошваюць, хмызняк прыбіраюць, і помнік выглядае належным чынам, як, дарэчы, і астатнія тры манументы, што ўвекавечваюць на тэрыторыі сельсавета памяць пра Вялікую Айчынную вайну.

На суботніку.

НА ПРЫВАТНЫХ УЧАСТКАХ

Ну і вядома, ніякага парадку не даб'ешся, калі жыхары не будуць падтрымліваць яго на сваіх сядзібах ды побач з імі. Прыкладам тут можа быць падворак Святланы і Аляксандра Ярмоцыкаў з Папіны. У іх, нягледзячы на немаляўнічую пару года, у двары сапраўдная прыгажосць. Пакуль няма кветак, вока радуюць элементы ландшафтнага дызайну, зробленыя рукамі гаспадароў: роўнымі радамі растуць дэкаратыўныя кусты, зелянее газонная траўка. Ва ўсім адчуваецца клапатлівая рука гаспадыні, што падтрымлівае парадак, і гаспадарская рука, якая гэты парадак усталявала. Прыгажосць навялі не толькі ў межах свайго ўчастка, але і ўздоўж яго да самай дарогі. Такіх жыхароў, на шчасце, многа. Іх заахвочваюць не толькі ў дзень вёскі.

Старшыня сельскага Савета часта выкладвае перадавы вопыт асобных грамадзян па вядзенні ўласнай гаспадаркі на сваёй старонцы ў сацсетцы. Сёння ў сельсавецкай групе налічваецца больш за 720 чалавек, што пры двухтысячным насельніцтве вельмі нямала. У інтэрнэце змяшчаюцца звесткі пра кожны суботнік, кожнае мерапрыемства, сход, ушанаванне сталых імянінніка ў і юбіляраў. І вядома, знаходзіцца месца для слоў падзякі актыўным удзельнікам грамадскіх акцый, такім, напрыклад, як Ніна Калпачук з Новай Папіны, Лідзія Кароль з Зарэчкі.

Святлана ЯСКЕВІЧ,
Драгічынскі раён.

ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Гомельоблстрой» (продавец) в лице антикризисного управляющего в деле о банкротстве Колеснева Н. М. извещает о проведении 3 апреля 2020 года открытого повторного аукциона со снижением цены на 10 % по продаже имущества в 11.00 в городе Гомеле по ул. Гагарина, 20, 2-й этаж

№ лота	Наименование предметов торгов	Начальная цена продажи имущества, без учета НДС (20 %), бел. руб.	Шаг аукциона – 5 %, бел. руб.	Сумма задатка без учета НДС (20 %), бел. руб.
Условие продажи: 1. Претендент на покупку (победитель) аукционных торгов самостоятельно и за свой счет проводит демонтаж, погрузку, транспортировку приобретенного на аукционе имущества. В случае нарушения целостности имущества Продавца при демонтаже и погрузке приобретенного имущества на Покупателя возлагается обязанность по приведению поврежденного имущества в первоначальное состояние. 2. В соответствии с действующим законодательством РБ (в части изменения подпункта 2.30 пункта 2 статьи 115 в Налоговом кодексе РБ с 1 января 2019 года) **реализация имущества осуществляется без учета НДС 20 %**			
Местонахождение лотов: лоты №№ 3, 4, 5, 7 – п. Корма, лот № 8, 11 – Житковичский р-н, д. Дьяковичи, лот № 9, – Б.-Кошелевский р-н, д. Морозовичи				
3	**Домик КДМ**, инв. № 10-033	**1 530,00**	76,50	153,00
4	**Вагон-бытовка**, инв. № 2126. **Захват для плит 2ПТМ**, инв. № 830. **Захват для плит 1ПТМ**, инв. № 831	**9 000,00**	450,00	900,00
5	**Вагон-бытовка 9000х3000**, инв. № 2202	**2 520,00**	126,00	252,00
7	**Контейнер офисно-бытовой СТШИ.С**, инв. № 828	**4 500,00**	225,00	450,00
8	**Контейнер офисно-бытовой СТШИ.С**, инв. № 829	**4 410,00**	220,50	441,00
9	**Вагон-бытовка 9000х3000**, инв. № 2201	**2 520,00**	126,00	252,00
11	**Вагон-бытовка 9000х3000**, инв. № 2136	**2 520,00**	126,00	252,00

Продавец: ОАО «Гомельоблстрой», г. Гомель, ул. Малайчука,12. **Порядок ознакомления с имуществом осуществляется по контактным тел.:** 8(029) 185-37-18 – управляющий в деле о банкротстве Колеснев Николай Михайлович; 8 (044) 700-40-60 – по спецтехнике и оборудованию Кучинский Владимир Александрович; 8 (044) 769-19-61, 8 (0232) 53-27-62 – по недвижимости Яроцкая Людмила Николаевна. **Шаг аукционных торгов – 5 (пять) % от начальной цены предмета аукциона и не изменяется в течение всего аукциона. Для участия в аукционе необходимо:** 1. Оплатить задаток на расчетный счет **Продавца (ОАО «Гомельоблстрой»):** р/с BY73 BLBB 3012 0400 0516 9300 1001, в Головной ф-л по Гомельской области ОАО «Белинвестбанк», БИК BLBBBY2X, УНП 400051693, назначение платежа – задаток за участие в аукционных торгах по лоту № (задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления); 2. Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов можно **с 20 марта 2020 г.** по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, 2-й этаж, каб. «Эксперт-Услуга» в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и 14.00 до 16.00. Прием заявлений для участия в аукционе **заканчивается 1 апреля 2020 г. в 16.00 включительно (предварительно по контактным телефонам Организатора торгов).** Заявления, поступившие после установленного срока, не принимаются. Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за **5 (пять) дней** до его проведения.

В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только единственным участником (претендентом на покупку), объекты аукциона продаются этому участнику при его согласии по начальной цене**, увеличенной на 5 (пять) %**.Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается **Продавцом** в течение **5 (пяти) рабочих дней** со дня проведения торгов. Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену. Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: подписать протокол о результатах аукциона; заключить договор купли-продажи в течение **5 (пяти) календарных дней** от даты подписания протокола о результатах аукциона; оплатить приобретаемое имущество, согласно договору купли-продажи в течение **10 (десяти) рабочих дней** с момента его подписания и возместить затраты и расходы на организацию и проведение аукциона в течение **5 (пяти) рабочих дней** с момента подписания протокола. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет исполнения обязательств по договору купли-продажи. Проводится аукцион в соответствии с Положением Открытого акционерного общества «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части) и с Законом РБ от 13.07.2012 № 415-З (ред. от 04.01.2014) «Об экономической несостоятельности (банкротстве)», ст.127–129. **Ранее опубликованное извещение о торгах размещено в газете «Звязда» от 15.01.2020г. № 8 (29122). Порядок оформления участия в аукционе, в том числе документации, необходимой для регистрации участника торгов, порядок проведения аукциона размещены на официальном сайте Организатора торгов – www.expert-usluga.by раздел «Аукционы» или www.gomeloblreklama.by, www.bankrot.gov.by. Дополнительная информация по контактным телефонам Организатора торгов: 8 (0232) 23-23-54, 23-23-56, 8 (029) 126-66-62.**

РУП «Институт недвижимости и оценки»
ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА
по продаже права заключения договора аренды сроком на 5 (пять) лет имущества, принадлежащего

ОАО «Тепличный комбинат Мачулищи»
на праве собственности

Лот № 1: право заключения договора аренды части продовольственного магазина с инв. 500/D-708041651. Общая площадь – 856,7 кв. м. Площадь, сдаваемая в аренду, – 585,78 кв. м. Адрес: г. Минск, ул. Колесникова П. Р., 36-207. Начальная цена с НДС – 2 474,92 руб. Задаток – 247,49 руб. Размер ежемесячной арендной платы – 8 810,65 руб. (521,34 б.а.в). Шаг аукциона – 5 %.
Обременение: ипотека (залог недвижимого имущества). Размер штрафа – 1 000,00 руб.
Условия аукциона: 1. Заключить договор аренды в течение 5 (пяти) календарных дней с даты проведения аукциона после предъявления Продавцу документа, подтверждающего оплату Организатору аукциона стоимости затрат на организацию и проведение аукциона. 2. Оплатить Продавцу стоимость приобретенного на аукционе Лота в течение 3 (трех) рабочих дней с даты проведения аукциона. 3. Оплатить Организатору аукциона стоимость затрат на организацию и проведение аукциона в течение 3 (трех) рабочих дней с даты проведения аукциона.
Цена продажи Лота не засчитывается в арендную плату, подлежащую уплате в соответствии с законодательством Республики Беларусь.
Аукцион состоится 21.04.2020 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, каб. 4.
Полный текст извещения, порядок оформления участия в аукционе содержатся на сайте Организатора аукциона ino.by.
Продавец: ОАО «Тепличный комбинат Мачулищи», Минская обл., Минский р-н, г.п. Мачулищи, ул. Солнечная, д. 6, тел. 8 (017) 504-46-06. Организатор аукциона: РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, пом. 9. Задаток перечисляется на р/с BY21BPSB30121543370109330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, BIC BPSBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Назначение платежа: задаток для участия в аукционе 21.04.2020. Заявления на участие и необходимые документы принимаются в рабочие дни с 20.03.2020 с 8.30 до 12.00, с 13.30 до 16.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, 11, каб. 7. Окончание приема заявлений 17.04.2020 в 11.00. Контактное лицо для осмотра Объекта – Астахов Дмитрий Александрович, 8 (029) 177-31-32.

☎ **Организатор аукциона: 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52 • www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by**

РУП «Институт недвижимости и оценки»
ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА
по продаже имущества
СООО «Чевляр»

Лот № 1: котельная, инв. № 602/D-35832, 197,1 кв. м. Адрес: Минская обл., Пуховичский р-н, г. Марьина Горка, ул. Калинина, 15А-2. Начальная цена, бел. руб. с НДС – 45 640,70. Задаток, бел. руб. – 5 000,00.
Лот № 2: производственное помещение, инв. № 602/D-35834, 556,3 кв. м. Адрес: Минская обл., Пуховичский р-н, г. Марьина Горка, ул. Калинина, 15А-4. Начальная цена, бел. руб. с НДС – 132 842,50. Задаток, бел. руб. – 13 284,00

Условия: 1. Подписать с Продавцом договор купли-продажи в течение 10 рабочих дней с даты проведения аукциона (после предъявления Продавцу копии платежного документа об оплате вознаграждения Организатора аукциона). 2. Оплатить Продавцу стоимость приобретенного на аукционе Объекта (Объектов) в течение 10 рабочих дней с даты подписания договора купли-продажи. 3. Оплатить Организатору аукциона вознаграждение в размере 3 % от цены продажи Лота № 1, 1,5 % от цены продажи Лота № 2 в течение 3 банковских дней со дня подписания протокола о результатах аукциона

Размер штрафа, предусмотренного соглашением о правах и обязанностях сторон в процессе организации и проведения аукциона, составляет 2 000,00 бел. руб.

Аукцион состоится 22.04.2020 в 11.00
по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 4.
Шаг аукциона – 5 %

Порядок оформления участия в аукционе содержится на сайте Организатора аукциона ino.by. Продавец: СООО «Чевляр», 220004, г. Минск, ул. Тимирязева, 9, АБК, ком. 703, 8(017) 203-35-94.
Организатор аукциона: РУП «Институт недвижимости и оценки», 220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 9. Задаток перечисляется на р/с BY21BPSB30121543370109330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, BIC BPSBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Назначение платежа: задаток для участия в аукционе 22.04.2020. Участник, желающий участвовать в аукционе в отношении нескольких лотов, вносит задатки в размере, установленном для каждого из лотов. Заявления на участие и необходимые документы принимаются в рабочие дни с 8.30 до 12.00, с 13.30 до 16.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, 11, каб. 7. Окончание приема заявлений – **20.04.2020 в 11.00.** Контактное лицо для осмотра Объектов – Мазелев Станислав Игоревич, 8(029) 623-57-60

☎ Организатор аукциона:
8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52
• www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by

РУП «Институт недвижимости и оценки»
ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА
по продаже имущества
ОАО «БЕЛГАЗСТРОЙ» – управляющая компания холдинга»

Лот № 1, состав: 1. Кран балка 11-5-3, инв. № БТ2.200. 2. Кран козловой ККС-10, инв. № БТ2.143. 3. Кран козловой ОЛТ, инв. № БТ2.353. 4. Кран подвесной с эл./талью, инв. № БТ144. 5. Кран с тельфером, инв. № БТ145. 6. Кран штабелер с эл./талью, инв. № БТ142. 7. Кран-балка, инв. № БТ252. 8. Кран-балка, инв. № БТ253. 9. Кранбалка, инв. № БТ199.1. 10. Счетчик жидкости и количества теплоты СВТУ-10М № 16474, инв. № БТ2.575. Местонахождение: Минский р-н, аг. Колодищи, ул. Чкалова, 51. **Начальная цена, бел. руб. с НДС – 33 048,00. Задаток, бел. руб. – 3 304,80. Шаг аукциона** – 5 %.

Аукцион состоится 02.04.2020 в 11.00
по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 4.

Порядок оформления участия в аукционе, условия участия в аукционе, срок заключения договора купли-продажи, условия оплаты, а также полный текст извещения содержатся на сайте Организатора аукциона ino.by. Продавец: ОАО «БЕЛГАЗСТРОЙ» – управляющая компания холдинга», 220030, г. Минск, ул. Советская, д. 4, тел. 8 (017) 200-71-17. Организатор аукциона: РУП «Институт недвижимости и оценки», 220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 9. Задаток перечисляется на р/с BY21BPSB30121543370109330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, BIC BPSBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Назначение платежа: задаток для участия в аукционе **02.04.2020.** Заявления на участие и необходимые документы принимаются в рабочие дни с 8.30 до 12.00, с 13.30 до 16.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, 11, каб. 7. Окончание приема заявлений – 31.03.2020 в 11.00. Первое полное извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 11.02.2020.

☎ Организатор аукциона:
8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52
• www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by

СВЕДЕНИЯ
О ПРОВЕДЕНИИ РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ
«Maggi с заботой о важном!»

Организатор рекламной игры – ООО «Пиар Куб», место нахождения: 220030, г. Минск, ул. Ленина, д. 50, 5-й этаж, оф. пом. 1, УНП: 192452588; электронный адрес: info@igra.minsk.by.
Наименование рекламной игры: «Maggi с заботой о важном!»
Сведения о государственной регистрации рекламной игры: рекламная игра зарегистрирована 10 декабря 2019 года Министерством антимонопольного регулирования и торговли Республики Беларусь. Свидетельство о регистрации рекламной игры № 3709.
Срок начала и окончания рекламной игры, включая срок выдачи выигрышей и опубликования результатов проведения рекламной игры: с 16 декабря 2019 г. по 27 марта 2020 г.
В рекламной игре приняли участие 54111 участников.
Призовой фонд разыгран полностью.
Сведения о Победителях рекламной игры с указанием их выигрышей размещены на интернет-сайте: **https://e-dostavka.by/.**
Телефон для справок по вопросам проведения рекламной игры: +375 29 3810085. Режим работы телефона для справок: в течение срока проведения рекламной игры с 09.00 до 21.00, пн–пт.

ШЧАСЛІВАЕ ДЗЯЦІНСТВА

Садок крокавай даступнасці

Дзіцячы садок новага тыпу адкрыўся нядаўна ў Драгічыне — гэта першая дашкольная ўстанова на Брэстчыне, якая знаходзіцца ўнутры жылога 40-кватэрнага дома. Ён размешчаны ў самым маладым гарадскім мікрараёне па вуліцы Днепра-Бугскай. Там цяпер актыўна вядзецца жыллёвае будаўніцтва — як шматкватэрных, так і прыватных дамоў.

— Да пачатку наступнага навучальнага года садок № 5 будуць наведваць 60 хлопчыкаў і дзяўчынак. Пакуль што гэтая лічба складае 37, дзеці падзяляюцца на тры групы ў залежнасці ад узросту, — кажа **загадчыца садка Аляксандра МАЦУК.** — У нас не стаяла задача стварыць інавацыйную пляцоўку, першапачаткова была неабходнасць у садку крокавай даступнасці. У горадзе пяць дзіцячых дашкольных устаноў, але не ўсім бацькам адналькава камфортна дабірацца да іх з дому. Мы працуем з 7.30 раніцы. Дапамагае выхоўваць малых штат работнікаў, які складаецца з 18 чалавек.

У такім садку створаны ўсе неабходныя для хлопчыкаў і дзяўчынак умовы: прасторная музычная зала, гаспадарчая частка, гульнявая, рэсурсная, дзе захоўваюцца дыдактычныя дапаможнікі і сучасныя цацкі, вялікі харчблок. Для абароны ад сонца і ападкаў пабудаваны навесы. Дзякуючы таму, што садок размяшчаецца на першым паверсе жылога дома, ён

мае асобны ўваход, спартыўна-гульнявую пляцоўку. Кошт такога аб'екта склаў 2,3 мільёна рублёў, якія былі выдзелены з абласнога бюджэту. Гэта значна ніжэй, чым у тыповых будынкаў дашкольных устаноў.

— Усе групавыя памяшканні размешчаны з аднаго боку, кватэры — з другога. Тут добрая ізаляцыя, гэта значыць, што ніякага шуму не будзе чуваць ні з нашага боку, ні з боку жыхароў. У будынку жывуць шматдзетныя сем'і, жыллё лічыцца сацыяльным, — дадала Аляксандра Мацук.

Нагадаем, першы дзіцячы сад новага тыпу адкрыўся ў Гомелі некалькі гадоў таму. Сёлета ў Брэсце плануецца рэалізацыя яшчэ аднаго такога праекта.

Дар'я ШЛАПАКОВА.
Фота аўтара.

ІНІЦЫЯТЫВА

ІМЯННЫЯ ЛАЎКІ І НАРОДНЫЯ ДАРОЖКІ

Цікавы праект па добраўпарадкаванні рэалізуецца ў Брэсце

Гарадскі сад у Брэсце — гэта стары новы парк, які з'явіўся ў абласным цэнтры да яго тысячагоддзя. Стары таму, што ён ужо быў у горадзе на мяжы XIX і XX стагоддзяў. А новы таму, што той, старадаўні, даўно зарос бур'яном і прыйшоў у заняпад. Сад аднавілі цалкам за апошнія некалькі гадоў. Добраўпарадкаванне цікавага аб'екта гарадскога асяроддзя працягваецца.

Гарадскі вал.

Фота Валерыя КАРАЛЯ.

Цяпер пачалася ўкладка новай тратуарнай сцежкі. Яна працягнецца ад цэнтральнай часткі саду да набярэжнай Мухаўца. А вось «праект» пешаходнай часткі стварылі самі наведвальнікі, прычым уласнымі нагамі. Паводле слоў **намесніка генеральнага дырэктара КУМВП «Брэсцкае гарадское ЖКГ» Сяргея ЖУКАВА,** камунальнікі кладуць плітку на месцы сцежак, якія пратапталі адпачывальнікі. Такім чынам, усё робіцца для максімальнай зручнасці людзей.

А вось уздоўж дарожкі неўзабаве з'явяцца новыя лаўкі. Іх зробяць у адным стылі на спецпрадпрыемстве. І будуць, мяркуецца, яны імянныя. Усе ахвотныя — як юрыдычныя асобы, так і фізічныя — змогуць праспансіраваць лаўкі з адмысловымі таблічкамі. На іх укажуць назву прадпрыемства ці ўстановы альбо прозвішча і імя чалавека, які прафінансаваў праект. Такім чынам у кожнага з'явіцца магчымасць упісаць сваё імя ў гісторыю горада. Гэта не брэсцкая выдумка — такія акцыі даўно праводзяцца ў розных краінах свету. У нас любяць згадваць Цэнтральны парк Нью-Ёрка, дзе ўстаноўлена каля 2000 імянных лавак.

Новую ініцыятыву падтрымалі ўжо больш чым два дзясяткі прадпрыемстваў і пяць грамадзян. Пра жаданне займець сваю лаўку ў гарадскім садзе заявіў народны артыст Беларусі кампазітар Эдуард Ханок. У Брэсце прайшло дзяцінства музыканта, тут ён хадзіў у школу. Сям'я жыла ў цэнтры горада, недалёка ад цяперашняга саду. Вось і вырашыў Эдуард Сямёнавіч у свой юбілей (сёлета яму спаўняецца 80 гадоў) зрабіць падарунак гораду дзяцінства. Згадзіцеся, добры прыклад для землякоў.

Святлана ЯСКЕВІЧ.

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Заснавальнікі: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Выдавец — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.

Адказны за выпуск: АНУФРЫЕВА В. А.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by

(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

АДРАС РЭДАКЦЫІ:
220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН 287 18 31;
e-mail: info@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 03.04.2009. 220013, г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79.

Тыраж 14.804. **Нумар падпісаны ў 19.30 19 сакавіка 2020 года.**